Тэкст:
**Natasza 9922@wp.pl**
Дызайн:
**lolcia05@tlen.pl**

# Муха ціп-топ!

**Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”**
**Беласток 2007**

**Рэдактар**
Ганна Кандрацюк-Свярубская

**Карэктура**
Яўгенія Палоцкая

**Аўтар здымка**
Матфей Сэвастыянік

**Тэхнічная рэдакцыя**
Адам Паўлоўскі

*Zrealizowano dzięki dotacji*
*Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji*

**ISBN 978-83-925904-4-6**

*Copyright © 2007 by Rada Programowa Tygodnika „Niwa”*

**Друкарня**
*„Offset-Print”, ul. Broniewskiego 14, Białystok*

## Ад аўтарак

З Оляй Калінай (**lolcia05@tlen.wp**) я сустрэлася 12 гадоў таму, у беластоцка-беларускім садку. Хоць нам ужо 15 гадоў, некаторыя далей называюць нас „дзеткамі з прадшколля”. Гэта таму, што ў нас неўтаймаванае пачуццё гумару, што мы можам смяяцца з усяго, нават калі няма з чаго...

Год таму мы дамовіліся з рэдактаркай „Зоркі” каб пісаць і маляваць гісторыі з жыцця сучасных гімназістаў. У цыкле „Муха ціп-топ” мы стараліся адлюстраваць у літаратурнай і карцінкавай версіі навучальны 2006/2007 год. Нашы праблемы з настаўнікамі і бацькамі, нашы клопаты і захапленні, першыя каханні і расчараванні.

Кніжку „Муха ціп-топ” аддаем у вашы рукі з пэўным страхам. Напэўна многія з вас знойдуць у ёй герояў падобных на сябе ды пакрыўдзяцца на нас. Хай лепш, думаем, палічаць сябе больш важнымі, бо пішам пра іх у кніжцы.

„Муха ціп-топ” нараджалася пад цёплымі крыламі рэдактар „Зоркі”, Ганны Кандрацюк, якая не шкадавала нам крытычных заўваг ды не дазволіла сарваць цыкл у моманты крызісу. Нашу падзяку кіруем у адрас рэдакцыі „Нівы” за магчымасць публікацыі на яе старонках і кніжнага выдання „Мухі ціп-топ”, а таксама ўсім „дзеткам з прадшколля”, асабліва Ганцы Пякарскай (за файныя ідэі) і Матвейку Сэвастыяніку — аўтару самых цудоўных у свеце фотаздымкаў.

**Наталька КАНДРАЦЮК-СВЯРУБСКАЯ**
(**natasza9922@wp.pl**)

# МУХА ЦІП-ТОП!

**— (1) —**

**Калі якія клопаты — вінаватая я!**

**Я, Бася Муха, вінаватая ў тым, што зрабіла і ў тым, чаго не зрабіла. Вакол мяне заўсёды многа сяброў, яны ведаюць, што калі здарыцца нейкая бяда, за ўсё адказная Бася Муха з другога „ф” класа.**

Сёння я думала, што выйду сама з сябе...

У нашай гімназіі няма крамы. На школьныя абеды ў нас мала ахвотных, часта па талерцы шпацыруюць мурашкі. Усе пакупкі мы рабілі ў спадара Антося, які мае краму насупраць нашай школы. Гэта не спадабалася спадарыні Воўк, нашай дырэктар. Яна не толькі забараніла нам хадзіць у краму „TOSIEK-SHOP”, але і ўвяла рэжым. За кожную пабыўку ў краме нам пагражалі штрафныя балы.

На перапынках была выстаўленая варта. За намі сачылі настаўнікі і прыбіральшчыца, працаўнікі канцылярыі і самая спадарыня Воўк...

Сёння, у час доўгага перапынку, мы з Ганкай, Касяй і Соняй выбеглі на двор. На варце нікога не было. Мы перабеглі дарогу і шмыганулі ў краму. Мы не паспелі ўвапхнуць у кішэнь кока-колу і салодкія булачкі, бо Ганка пабачыла на сходах спадарыню Воўк. Яна спісвала хлапцоў, якія вярталіся ад Антося .

— І што цяпер? — спытала напалоханая Соня. — Я не хачу мець штрафных балаў.

— А думаеш, што я хачу? — агрызнулася ёй Кася.

— Ведаю! — крыкнула Ганка, — перачакаем тут да канца перапынку.

— Але, здаецца, — перарвала я, — спада-

# МУХА ЦІП-ТОП!


1
АНТОСЬ
АНТОСЬ
TAXI
АНТОСЬ
2
СЫР
5зл.
КОЎБАСА
КУРЫЦА
3
У АНТОСЯ

рыня Воўк ідзе ў краму? Давайце схаваемся за лядоўняй!

Спадар Антось адобрыў нашу канспірацыю:

— Хутчэй! — сказаў.

Увесь доўгі перапынак мы прасядзелі за лядоўняй, а калі пачулі званок і на сходах не было варты, мы рвануліся на двор. У пэўны момант я пачула, што на маёй спіне ляжыць цяжкая рука. Ганкі, Соні і Касі не было. Я павярнула галаву і пабачыла твар спадарыні Воўк:

— Я бачу, што вучні не разумеюць, што ім гавораць, — сказала яна службовым тонам.

— Але я была такая галодная... — пачала я.

— Гэта твая праблема, — строга адказала дырэктар, — а другая, гэта такая, што маеш яшчэ 15 штрафных балаў. Мне мусова пагаварыць з тваімі бацькамі і выхавацелькай. Як цябе завуць?

Спачатку я хацела назваць фальшывае прозвішча, але падумала, што навару сабе яшчэ большых клопатаў.

— Я... я... — прызналася я, — Бася Муха, з II „ф” класа.

— Ах — гэта ты! — прашаптала з уцехай дырэктар. — Можаш ісці ўжо на ўрок.

Спадарыня Воўк пайшла ў школу, а я ўсё стаяла на сходах і думала пра сваё дурное шчасце. Раптам каля мяне з'явіліся мае сяброўкі Ганка, Кася і Соня.

— Чаму ты не схавалася разам з намі?! — крыкнула Соня. — Уся гімназія ведае, што спадар Антось спецыяльна ставіць свой фургон перад крамай, каб у час *налёту* мы маглі прыхавацца!

# МУХА ЦІП-ТОП!

**— (2) —**

**Сёння наш клас пабываў на экскурсіі ў Кнышынскай пушчы. Мы паехалі з нашай выхавацелькай Аўрэліяй і класам II „б”.**

У аўтобусе нашая пані гід распавядала як у часы СССР было добра і як цяпер дрэнна жывецца. Яе ніхто не слухаў, мы смяяліся і спявалі песні. Найгаласней спявала Соня, таму экскурсаводчыца паклікала яе да сябе і сунула ў рукі мікрафон.

— Спявай! — загадала неяк злосна.

Соня вельмі нячыста праспявала чатыры песні. Мы прыкідваліся, што Соніны песні найпрыгажэйшыя ў свеце і заўзята пляскалі ёй у далоні. Што тут ні казаць — мы былі пад уражаннем, што Соня ўсё ж адважылася і заспявала сола.

У Супраслі мы падзяліліся на групы: клас II „б” пайшоў у музей, а мы пацягнуліся на шпацыр у лес. Наша выхавацелька ішла і ўглядалася на хмаркі, а мы бегалі дзе толькі хацелі. А калі ўжо ўсе вярталіся ў музей, нехта прыкмеціў, што няма з намі Ігара і Паўла. Мы не сказалі Аўрэліі пра „дэзерціраў”. Дваццаць хвілін пазней наш сябра Алік атрымаў эсэмэску ад Ігара. Ён пісаў: *Мы з Паўлам сядзім у Pogodzie Express . Праз дваццаць хвілін будзем ужо ў Беластоку.*

— Уоў!!! — пракаментавалі мы тую навіну.

Калі мы прыйшлі ў музей, нам раздалі білеты, а наша пані Аўрэлія не прыкмеціла, што яе група нікне ў вачах.

— Спадарыня Янкоўская, асталіся ў нас два білеты, — паінфармавала нашу выхавацельку экскурсавод.

# МУХА ЦІП-ТОП!



— Дык вы, мабыць, замнога купілі, — спакойна адказала Аўрэлія.

Пасля доўгай і нудотнай выстаўкі мы кінуліся ўсёй бандай у сувенірную краму. Нам падабаліся кітайскія цацкі. Адны куплялі мыльныя бурбалкі, іншыя — безгустоўныя карцінкі. Словам — трацілі грошы на абы-што, каб толькі іх пазбыцца.

У планах было яшчэ вогнішча. На жаль, на месца, дзе меў гарэць касцёр, трэба было ісці яшчэ кіламетр. Аўрэлія адмаўляла нас як умела, і мы, вядома, здаліся. У сапраўднасці ішло пра ейныя туфлі-„шпількі”; яна пабаялася, што трэба зноў дзесьці ісці. Ну, і вогнішча гарэла без нас.

У паваротнай дарозе за нас узялася зноў пані гід. Яна вымавіла вельмі важны сказ, які, я думаю, кожны з нас прыняў да сэрца.

— Сёння ў нас безнадзейная моладзь. Месяц таму ў мяне была група з далёкай Сібіры. Гэтыя людзі ўсім цікавіліся. Пабачыце вы самі! Гэта ім будзе належыць свет і будучыня!

Усе смяяліся, нават наша выхавацелька Аўрэлія. Экскурсаводка, вядома, пакрыўдзілася. Яна ўжо больш не гаварыла, адно глядзела ў акно і пра нешта думала.

У хаце ўсе кінуліся да камп'ютэраў. Мы сядзелі *на асьцы* (gadu-gadu) і пляткавалі пра экскурсіі. Найбольш пра Ігара і Паўла. Усе мазгавалі ды гадалі як склаўся іх нефармальны маршрут. Бо хлопцы, як адзіныя, маўчалі?!



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (3) —**

**Учора вечарам я прыгадала, што заўтра будуць аж тры кантрольныя: па матэматыцы, па англійскай мове і па біялогіі. Я не падрыхтавалася, праўду кажучы, мне не хацелася вучыцца. Таму я патэлефанавала Ганцы, каб запытаць ці яна сядзіць у кніжках і зубрыць.**

— Чэсць!

— О! Чэсць, Бася! Што здарылася? Ты мяне сарвала з ложка.

— Прабач, хачу толькі спытацца, ці памятаеш, што заўтра ў нас тры кантрольныя?

— Што? — крыкнула Ганка.

— Я таксама не магу вучыцца. Сяджу і камбіную, як тут не атрымаць адзінкі.

— А ці нехта ў нас адзначаў нядаўна дзень нараджэння? — спытала Ганка.

— Здаецца, так! Учора Матвейку стукнула 14.

— Ну так! — падбадзёрылася Ганка. — Тады раніцай купім малы падаруначак. Матвейка ж любімчык усіх настаўнікаў.

— Файна! — я паклала трубку тэлефона і пайшла спаць. Праект Ганкі спадабаўся і супакоіў мяне, я адчувала, што ўсё будзе добра.

І так, сёння раніцай, Ганка прыйшла ў школу з тортам і падарункам: кніжкай пра ружовага парсючка. Мы дамовіліся, вядома, і з Матвейкам (два дні таму мы шумна адсвяткавалі ў яго хаце ягоныя народзіны і з'елі торт).

На першым уроку матэматыкі я, Ганка, Кася і Соня ўвайшлі ў клас са спевам „Многае лета"!

Настаўніца спявала з намі, а найважней-


Многае лета!!!
Многае лета!!
Біялогія
Хімія

шае, што адтэрмінавала кантрольную. Праўда, у журнале як вол было запісана, што наш сябра нарадзіўся два дні раней. Настаўніца гэта бачыла, але нічога не сказала.

Таксама было і на англійскай мове. Мы з Ганкай паціху цешыліся, што наш план набірае цела. А клас, вядома, дзякаваў за ратунак. У гэтым месцы дадам, што па кожным уроку Матвейка аддаваў нам торт і кніжку, каб мы мелі іх для далейшага хепенінга. Аднак, перад урокам біялогіі, які вядзе наша выхавацелька Аўрэлія, нам не хапіла запалак і мы з Касяй пабеглі да Антося. Калі мы выбеглі з крамы, пабачылі на сходах Гену Ляскоўскага, бадзёрага настаўніка фізкультуры і злосную спадарыню Воўк. Яны сачылі за тым каб ніхто з вучняў не выбягаў у магазін „TOSIEK-SHOP". Мы зноў прасядзелі ўвесь перапынак у Антося за лядоўняй. Калі мы прыбеглі на ўрок, Аўрэлія ўжо раздала кантрольныя, але калі мы грымнулі „Многае лета" і запалілі свечкі на торце, яна махнула рукой і адтэрмінавала кантрольную. Торт мы з'елі на гэтым уроку, ён ужо не быў нам патрэбны. А Матвейка ўзяў сабе кніжку, „за супрацоўніцтва".

Мы цешыліся як малыя кацяняты, хаця сумняваліся, ці такі план зможам яшчэ паўтарыць. Як вядома, настаўнікі не любяць паўтораў, але ўмеюць належным чынам ацаніць вынаходлівасць вучняў, нават калі ў іх вачах свецяцца хітрыкі!



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (4) —**

**Усё пачалося на першым уроку біялогіі, калі спадарыня Воўк прыйшла ў наш клас з нейкім хлапцом, якога я раней ніколі не бычыла.**

— Гэта Міколка, — сказала яна, — з сённяшняга дня ён будзе ў вашым класе.

— Цікава, чаму нас сустрэў такі гонар, — гадалі мы ўголас і слушна знюхалі тут інтрыгу. Нехта паставіў падобнае пытанне дырэктарцы.

— Бо ён нідзе не можа вытрымаць больш трох дзён, — адказала з пэўным хваляваннем дырэктар, — у якую школу не пойдзе, адусюль яго гоняць. А ў нас, — спадарыня Воўк бездапаможна развяла рукамі, — няма выбару, ён мае тут прапіску.

Скажу праўду, я нават уцешылася, што нехта новы дайшоў у наш клас, можа будзе смяшней?!

— Сядзь з Басяй, — сказала Аўрэлія. — Яна сёння адна і ёй напэўна сумна.

— Добра-добра, — адказаў хлопец і прысеў да мяне.

У першы момант я злякалася:

— А раптам ён насваволіць і ўсё зноў будзе на мяне?!

На развітанне спадарыня Воўк сказала нешта такое:

— А вы, даражэнькія, будзеце яму добрым узорам. Ну *да пабачэння!*

Яна нават не паспела закрыць дзверы, як той Міколка стаў размаўляць з Ігарам. Праз наступныя хвіліны высветлілася, што яны пражываюць на той самай вуліцы. Аўрэлія ўвесь урок напамінала ім, каб перасталі гаварыць, але яны яе не слухалі. Гутарылі яш-

# МУХА ЦІП-ТОП!



чэ галасней, як на нейкім базары. І, вядома, ужо на першым уроку Міколка зарабіў першую заўвагу ў вучнёўскі дзённік. Але хлапец гэтым зусім не пераняўся. На перапынку ён выкінуў цераз акно крэсла і кветку, якую захапіў на калідоры. Уся школа смяялася з яго выбрыкаў, але на ўроку матэматыкі жарты скончыліся. Калі спадарыня Іванчэўская, якая нас вучыць матэматыкі, пайшла ў прыбіральню, Міколка шмыгануў да дзвярэй і перакрунуў замок. Клас залівався смехам. Спадарыня Іванчэўская доўга грукацела ў дзверы, а пасля пайшла па дырэктарку. Да гэтага часу нехта адкрыў дзверы. Спадарыня Воўк нічога не сказала, толькі ўхапіла Міколку за вуха і павалакла за сабой у кабінет. Нам даталіся „ўзнагароды" за калабарацыю з жулікаватым сябрам. Пад канец урока спадарыня Іванчэўская загрузіла нас дамашнімі задачамі.

Мы крыху апрытомнелі. Калі Міколка вярнуўся ў клас, усе маўчалі і ніхто не хацеў з ім гаварыць, хоць ніхто не мог перастаць пра яго думаць.

Я не ведала што думаць — столькі заўваг я не назбіраю за цэлы год — і цікава, колькі іх будзе ў Міколкі ў чэрвені? У першы дзень ён зарабіў пяць заўваг.



# МУХА ЦІП-ТОП!

**— (5) —**

**На ўроку гісторыі наведаў нас Нягарчук, настаўнік рэлігіі. Урокі рэлігіі бываюць у нас вельмі рэдка, можа раз у месяц.**

— Які гэта клас? — спытаў ён.

— Ну, II „ф”, — адказалі мы.

— Чаму вы не ходзіце на маю рэлігію? — Нягарчук быў злосны. Мы маўчалі, чакалі што ён скажа...

— Чакаю сёння, на дзесятым уроку, — аб’явіў ён нам і знік за дзвярыма.

Усе вучні нашага класа пачалі смяяцца. Ніхто, здаецца, не меў намеру ісці на рэлігію! І так на канец школьнага года Нягарчук, тым што не былі ні разу на ўроку паставіць чацвёркі, а тым, што прыйшлі хоць раз — пяцёркі (так было ў мінулым годзе).

Пасля дзевятага ўрока мы ішлі ўжо ў распраналку. Па дарозе мы сустрэлі спадарыню Воўк, якая завярнула нас і загадала ісці на рэлігію. Нягарчука, якога мы між сабой празываем „Нягарай”, яшчэ не было. Ён, так як універсітэцкі выкладчык, спазніўся на пятнаццаць хвілін. Узяў новую тэму, але ніхто не меў сшытка, каб яе запісаць. „Нягара” не пераймаўся і пачаў апавядаць нам пра Расію. Гэта была яго любімая тэма, якую цягнуў без канца ўжо другі год.

Адначасова „Нягара” крытыкаваў усё нашае. У пэўны момант стаў ён весці палітычную агітацыю. Ён казаў на якога кандыдата павінны аддаць свой годас нашы бацькі ў час самаўрадавых выбараў.

Мы пачалі спрачацца. Найгаласней — я. „Нягара” хацеў пацягнуць мяне за вуха, але ведаў, што ў адносінах да вучня нельга

# МУХА ЦІП-ТОП!



прымяняць насілле і ён адумаўся:

— Падай, калі ласка, нумар тэлефона да бацькі, — крыкнуў ён, — мы пагаворым з ім!

Я ведала, што мае бацькі не будуць захоплены такім тэлефонам. Яны чамусьці заўсёды бяруць бок настаўніка. І ў маёй прыгожай галоўцы бліснула ідэя. Я вырашыла, што дам нумар Ганкі, яе сёння не было ў класе.

— А зараз МЫ, — працадзіў з нотай помсты „Нягара", — патэлефануем спадару Мусе.

У мяне астаўся толькі адзін выхад — даць драла! І я выбегла з залы. Я гаварыла, што маю яшчэ заняткі ў музычнай школе і мне трэба там быць праз дзесяць хвілін. Ужо на панадворку я паслала эсэмэску Ганцы. Прасіла, каб яна не падымала трубку, калі ў яе тэлефоне высвеціцца невядомы нумар.

З часам усё разышлося па касцях, хоць з усяго атрымалася смешная справа. З дапамогай *стартэра* за дзесяць злотых мы званілі спадару Нягарчуку і падказвалі яму, на каго ён павінен галасаваць на самаўрадавых выбарах. Мы, вядома, выбіралі кандыдатаў, якіх ён ненавідзеў!



# МУХА ЦІП-ТОП!

— (6) —

**Два тыдні таму, у сераду, дзяўчаты з нашага класа закончылі ўрокі раней чым хлопцы. Калі мы з Ганкай, Касяй і Соняй выйшлі са школы, я ўсведаміла сабе, што мая куртка асталася ў школе.**

Я вярнулася ў распраналку, надзела куртку і ўжо мела ісці... Але... У куточку я пабачыла штосьці, што вельмі нагадвала камізэльку Ганкі, якую яна насіла ў пачатковай школе. Я ўзяла яе з сабой і аддала сяброўцы. Тая нават не глянула на старую апранаху, толькі ўкінула яе ў сумку, затым мы развіталіся і кожная пайшла ў свой бок.

На другі дзень наш клас наведала спадарыня Воўк. Яна мела загадкавы воблік.

— Увага! — сказала яна суровым тонам. — Вучню вашага класа прапала камізэлька. Ці можа хто з вас яе бачыў?

Усе запярэчылі.

— Глядзіце, — цягнула Воўк, — я і так знайду злодзея. Лепш каб ён адразу прызнаўся да гэтага ганебнага ўчынку. Тады і кара будзе лягчэйшая.

Усе ў класе маўчалі. Воўк абкінула нас крывым зрокам і выйшла. Мы адразу пачалі перашэптвацца, дапытвацца ў чым справа. Каму прапала камізэлька? Усе пыталі ўсіх наўкола, але ніхто пра нішто не ведаў. На гэты раз наш Міколка справіўся „на плюс", ён першы знайшоў ахвяру. Вось, дзякуючы нашаму жуліку, мы даведаліся, што камізэльку ўкралі Сяргею. Мы спачатку смяяліся і жартавалі з разявакатага Сяргея. Але жарты хутка скончыліся. Ужо пасля ўрокаў пані Міся, мама Сяргея, стала тэлефанаваць бацькам Міколкі, Ігара і Паўла. Яна наракала, што ў класе крадуць

# МУХА ЦІП-ТОП!



вопратку. Бацькі вельмі сур'ёзна ўспрынялі яе скаргу, пасля нават вялі допыты і следства. Ніхто не прызнаўся да віны, хоць кожны з хлопцаў атрымаў кару. Ім забаранілі чыпець „на асьцы" ды іграць у „Тыбю". Хлопцам сапраўды было крыўдна, яны нічога дрэннага не зрабілі…

Цягам двух тыдняў камізэлька не знайшлася. Усе ўжо пра яе забыліся, у кожнага з нас свае справы.

І вось, сёння, Ганка прыйшла ў школу з дзіўнай мінай. Мы не ведалі што сталася, але сяброўка адразу ўсё расказала.

— Учора вечарам я прыбіраю ў шафе, бачу, а там вісіць тая няшчасная камізэлька. Ад уражання аж прысела. Я не ведаю як яна там апынулася. Нехта падкінуў мне свінню — ці як?

Мы памаўчалі, а пасля я, Кася і Соня сталі смяяцца. Я мігам прыдумала рэканструкцыю гэтай злачыннай дзеі.

— А памятаеш як аднойчы я знайшла нейкую апранаху ў распраналцы?

— Божачкі! — пачырванела Ганка. — Я тады нават не паглядзела, што прынесла дахаты.

Пасля, калі нікога не было на калідоры, мы пакінулі Сярожкаву камізэльку ля століка цёткі-прыбіральшчыцы. Яна адна ведае як вырашыць справу і не пашкодзіць вучню.

Мы крыху баяліся прасіць прабачэння ў Сяргея. А раптам, — думалі, — пані Міся стане званіць нашым бацькам і абзываць нас зладзейкамі? А тыя, у рамках кары, забароняць нам карыстацца камп'ютэрам?!

## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (7) —**

**У гэтым годзе наш клас меў паставіць спектакль на школьнае свята. Мы мелі выступіць перад усёй школай. Гэта лічылася гонарам!**

У час першага чытання сцэнарыя ўсе сябры смяяліся пад носам, нават сама Аўрэлія. Хоць тэкст быў напісаны ў апошнія гады, ён быў акрашаны старымі прыказкамі і словамі з пачатку XIX стагоддзя. Так, ці інакш, наша тройка: я, Ганка і Матвейка рашыліся выступіць у адной сцэне. Ужо на рэпетыцыях мы не маглі стрымацца ад дурнога рогату.

Аўрэлія не сказала нам як трэба адзецца да спектакля, яна абяцала прыдбаць касцюмы з часоў генерала Напалеона Банапарта. І, відавочна, пра ўсё забылася. Добра, што паратавала Ганка, якая на кошт выхавацелькі выклікала таксі і паімчала дахаты па „касцюмы" — усякія непатрэбныя апранахі.

— І табе нешта знойдзем, — пацешыла мяне Ганка. Яна стала выцягваць з мяшка лахі ды па чарзе абдзяляць імі ўсіх „акцёраў". Мне папаўся вайсковы капялюш, Сяргеева камізэлька, вышываная кашуля, штаны „алібабы" ды чаравікі „гляны". Апошні элемент формы падкінуў, а дакладней скінуў са сваіх ног, Міколка. Я іграла генерала. Перад выхадам на сцэну падбегла да мяне Кася і намалявала мне чорныя вусы. Усе, хто мяне бачыў, хвалілі, нават спадарыня Ваўк:

— Добра выглядаеш! — сказала дырэктарка.

У адзінаццаць гадзін пачалася ўрачыстая лінейка для трэціх класаў. Я, Ганка і Матвейка маліліся, каб не ахапіў нас дурны смех.



Дык што з таго, нашы малітвы не былі выслуханы. Ужо пасля трэцяга сказа я пачала трэсціся і чмыхаць ад смеху. Ганка таксама не стрымала і зарагатала. Наш дурны смех заразіў і публіку, якая выконвала дурныя жэсты і сыпала такія ж каментары.

— Прашу захаваць павагу! — выгукнула ў пэўны момант спадарыня Воўк. — Гэта вам не кабарэ!

Калі мы сышлі са сцэны, Ганка расплакалася. Што будзе, калі пра ўсё даведаецца яе мама? На перапынку спадарыня Воўк папярэдзіла нас, што калі зноў будзем смяяцца, дык не выступім ужо ў яе школе! Мы ўзялі яе словы да сэрца...

У час чарговых дзвюх пастановак мы выступілі „на зважай" — як патрабаваў сцэнарый. Нас нават пахвалілі настаўнікі. Але публіка не даравала. Сябры мелі да нас прэтэнзію, што мы іх не рассмяшылі так як трэцякласнікаў.

Калі пасля ўрокаў я ішла дахаты, за мною ўсе азіраліся, смяяліся. Я таксама смяялася, хоць не ведала, што смяюся сама з сябе. У мяне пад носам асталіся генеральскія вусы.



## МУХА ЦІП-ТОП!

— (8) —

**Разам са снежнем у нашу школу завіталі кантрольныя. Бывае час, калі іх зусім няма і мы не пераймаемся школай. На жаль, цяпер мы мусім сядзець усю ноч і дзень ды зубрыць.**

Па гэтай прычыне я не магу чытаць кніжак і сядзець на *асьцы*. Але ёсць і такія, што ўвогуле не пераймаюцца навукай. Добрым прыкладам такога вучня — Міколка. Хлапец вяртаецца дахаты з панадворка ў дзесяць гадзін вечара, а пасля яшчэ доўга чыпіць ля камп'ютэра. Ніхто яму не зайздросціць ацэнак, наадварот, усе паказваюць на Міколку пальцам. Ну, але няма карысці і з навукі Сяргея. Хоць ён увесь час сядзіць у кніжках, але, на жаль, як і Міколка мае адны двойкі і адзінкі.

З маімі ацэнкамі таксама не найлепш. Апошнім часам я атрымала тройкі па біялогіі, матэматыцы, хіміі, англійскай мове і інфарматыцы. У Ганкі, Касі і Соні — вельмі падобныя вынікі.

Сапраўды, баюся думаць якую ўжо кару падрыхтуюць мне бацькі, калі вернуцца з бацькоўскага сходу?!

* * *

Сёння наш клас піша кантрольную па фізіцы. Я і мае сяброўкі не разумелі пройдзенага матэрыялу. І мы папрасілі дапамогі ў Марты, найлепшай вучаніцы ў класе, каб яна села ззаду за намі і дапамагла рашыць задачы. Марта так і зрабіла. Настаўнік фізікі, спадар Віснеўскі, у гэты раз нас не пільнаваў. Усе шапталіся, ардынарна перакідваліся шпаргалкамі. Я папрасіла Марту, каб яна дапамагла рашыць мне пятую задачу. Дзяўчына адарвала кавалак сваёй карткі і напісала мне поўны адказ. Я бы-


КАНТРОЛЬНАЯ
101
CHIPS

ла шчаслівая і пачала спісваць змест. У гэты момант да Марты падышоў спадар Віснеўскі і вельмі зацікавіўся яе працай.

— А чаму ў цябе адарваны кавалак карткі? — спытаў ён.

— А... бо, — дзяўчына не ведала што сказаць, — я пісала і так чамусьці адарвала...

— Глядзі! Калі дзе знайду гэты кусок, тады ...

Я адразу засунула шпаргалку ў кішэню і чакала пакуль спадар Віснеўскі адыдзе. Ды зноў пачала спісваць са шпаргалкі.

У гэты момант Ігар папрасіў дапамогі настаўніка, бо чагосьці не разумеў. Віснеўскі глядзеў у ягоны сшытак і адначасова схапіў мяне за руку. Ад нечаканасці я аж падскочыла! Настаўнік узяў тую няшчасную шпаргалку ды адразу дапасаваў яе да карткі Марты.

— Вось і бракуючае звяно! — сказаў ён.

У класе ўсе смяяліся, вядома, апрача Марты і мяне. Мне было сорамна, што з-за мяне яна не атрымае шасцёрку. На свой рахунак я дапісала яшчэ адну дрэнную ацэнку. Я прадчувала, што ў гэты раз не змагу выцягнуць тройку!



# МУХА ЦІП-ТОП!

**— (9) —**

**Калі я ўчора сядзела „на асьцы", Ганка даслала мне інтэрнэтны адрас: www.Byk26.fotka.pl.**

Я хуценька ўвайшла на гэтую старонку і пабачыла на ёй тры здымкі настаўніка фізкультуры — спадара Геніка Ляскоўскага. На першай фотцы ён абдымаў дзяўчыну, якая на сабе мела толькі станік. На другім здымку ён трымаў у руцэ куфаль піва. А на трэцім Ляскоўскі прэзентаваўся без кашулі ды хваліўся сваёй мускулатурай і аброслым торсам. На нізе, пад гэтай галерэяй, красаваўся нумар „аські" Ляскоўскага, які я сабе запісала. Пасля гадзіны, здаецца, ужо ўсе вучні нашай гімназіі пабачылі здымкі Ляскоўскага. Я і мае сяброўкі гаварылі з Ляскоўскім па Інтэрнэце, але ён хутка нас заблакіраваў, здаецца, адчуў наш малады ўзрост.

Генік Ляскоўскі ведаў ужо, што вучні пабачылі яго здымкі ў Інтэрнэце, але чамусьці не падумаў іх выкінуць. Аднак тое, што зрабіў Міколка, прымусіла яго да рашучага дзеяння. Мой сябра даслаў на электронную пошту нашай школы адрас: www.Byk26.fotka.pl. Настаўнік інфарматыкі, Пятрусь Занеўскі, адразу паказаў усё спадарыні Воўк і яна, як не цяжка здагадацца, страшэнна была ўзбударажаная пабачаным.

— Гэта ж неадказны чалавек! — крычала дырэктарка, — калі гэтыя здымкі пабачаць вучні, яшчэ набяруцца дурных прывычак і самі стануць выстаўляцца ў Інтэрнэце!

Калі на другі дзень Генік Ляскоўскі паказаўся ў школе, Міколка хадзіў яго следам

## МУХА ЦІП-ТОП!



і крычаў:

— Гэй, бык! Бычок 26! А дзе ваша піва? Прыгожая ў вас дзяўчына!

Настаўнік быў збянтэжаны словамі жуліка. У дадатак дырэктарка паклікала яго да сябе:

— Вы не разумееце, што Інтэрнэт вельмі папулярны сярод моладзі і што кожны можа пабачыць вашы здымкі?! Яны псуюць рэпутацыю нашай школе! Прашу як найхутчэй прыбраць іх з сайта, бо інакш...

— Добра, добра! — „Бык 26" шчыра пакаяўся ды паабяцаў выправіць памылку.

Вечарам не было ўжо сайта Byk26.fotka.pl. Але сёння хтосьці зрабіў спадарыні Воўк тры здымкі і паставіў іх на сайце fotka.pl. Не ведаю хто зрабіў такі жарт, але калі пабачыць іх дырэктарка, яна разарве на дзве часткі аўтара здымкаў.



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (10) —**

**У дзень, калі меў адбыцца бацькоўскі сход, мне і маім сяброўкам ад страху балелі жываты. На сход пайшла мая мама і гэта быў дрэнны знак.**

Мама заўсёды гутарыць з кожным настаўнікам і перапісвае ўсе ацэнкі і заўвагі. А ў гэтым годзе яны не найлепшыя. З таго, што пасля расказала мне Ганка (яна была разам з мамай на сходзе) бацькі найперш сустрэліся са спадарыняй Воўк. Дырэктарка не любіць майго класа.

— Клас II „ф" найгоршы ў школе, — пачала Воўк, — там найбольшыя жулікі. Ніколі ў гісторыі нашай школы вучні не выкідалі крэслаў цераз акно. Ды яшчэ на кожным перапынку яны парушаюць рэжым і тайком бегаюць у краму спадара Антося. Прашу, каб вы пагаварылі са сваімі дзеткамі. А найбольш засцярог у мяне да чатырох гімназістак...

Бацькі пераглянуліся між сабой, ніхто не ведаў каго мае на думцы Воўк.

— Гэта Бася Муха, Ганна Генюш, Соня Квяткоўская і Кася Міцкевіч, — прадэкламавала дырэктарка. — Я прашу, каб бацькі гэтых дзяўчат асталіся на асобную размову. Іншыя ўжо свабодныя. Да пабачэння!

Ганка таксама выйшла з апошнімі. Яна паспела яшчэ ўлавіць грозны позірк сваёй мамы ды збялела ад страху.

Мая мама была здзіўленая словамі дырэктаркі. Яна ўпершыню пачула, што я непрыстойна сябе вяду ў школе.

— Ці можаце канкрэтна назваць правіны маёй Басі? — спытала.

— Так, магу. Яна спявае на перапынках,

## МУХА ЦІП-ТОП!



зачапляе ўсіх хлапцоў і заўзята спрачаецца з настаўнікамі на ўроках!

— А я ўжо думала, што яна выкідае вам крэслы цераз акно, — сказала мама Соні.

— Ну, не... — Воўк была злосная за апошнюю заўвагу і адпаліла: — Ваша дачка робіць яшчэ горшыя рэчы!

— Я слухаю вас?

— Яна спрачаецца з настаўнікам рэлігіі, яна проста лезе яму на „голаў”.

— Калі ваш настаўнік не ўмее запанаваць над класам — яго праблема!

— І я думала, што пачую тут нешта страшнае, — дакінула мая мама.

— Так..., — дырэктарка хацела нешта сказаць, але раздумалася. Яна бачыла, што нашы бацькі маюць іншы чым яна погляд на нас. Яна дакінула яшчэ некалькі інфармацый пра шкоднасць Інтэрнэту і распусціла сход.

Сустрэча з Аўрэліяй была сімпатычнай, выхавацелька нас хваліла. Аднак нашы ацэнкі моцна знервавалі бацькоў. Пасля сходу яны раіліся між сабой як заахвоціць нас да навукі і як пакараць, каб не пагоршыць справу. Праўда, пасля сходу мы акунуліся ў кніжкі (цікава ці надоўга?!). Пакуль што, кожны мае кару. Ганка не можа сядзець на „асьцы” да канца месяца. Ігару забаронена выходзіць пасля ўрокаў на панадворак. Я не атрымала падарункаў на „Мікалайкі”. У Соні выключаны мабільнік. Паўлу забаранілі сустракацца з Міколкам... А гэты апошні зусім не атрымаў кары. Міколка ўвогуле не сказаў у хаце пра бацькоўскі сход.



— (11) —

**— Не ведаю з чаго пачаць. Сёння ў мяне быў файны дзень. Я ніколі яшчэ не мела такога вялікага поспеху ў каханні. Доўгі час я ўвогуле не думала пра каханне, бо ведала, што яно ніколі мяне не сустрэне.**

Я была ўпэўнена, што ніколі не спадабаюся файнаму хлопцу. Ну, хіба што такому Тамашу з другога „ц" класа, самаму нудотнаму хлапцу ў школе. Але апошнім часам я пазнаёмілася з Петрусём з II „а". Міколка нагаварыў яму дурнот, між іншым, што я без розуму ў ім „закаханая". Праўда, хлапец пачаў вельмі ахвотна са мной размаўляць. Ён падыходзіў да мяне, Ганкі, Касі і Соні на кожным перапынку і нам сапраўды добра з сабой размаўлялася. У мінулы чацвер я заўважыла, што Пятрусь сябруе з Іонашам, які заўсёды мне падабаўся. Дзякуючы Петрусю, я пазнаёмілася з Іонашам. Вечарам ён напісаў мне на „асьцы". Я была шчаслівая. Ён пісаў, што я такая прыгожая... Калі я чытала ягоныя словы, у мяне ад радасці пачырванелі шчокі.

— Ты падмалявалася? — спытала мяне мама. — Выглядаеш быццам бурак.

— Не, у мяне баліць галава, — зманіла я.

— Дык не чыпі ля камп'ютэра як тая затычка ад пекла, — параіла мне.

Лёгка сказаць — не чыпі! Я не чыпела. Я пісала Петрусю, які не ведаў, што я адначасова размаўляю з Іонашам. Мне было смешна, бо хлопцы пісалі амаль аднолькавыя словы. А ўчора я пазнаёмілася яшчэ з трэцякласнікам Матфеем. Ён сам падышоў да мяне на перапынку і пачаў сыпаць

# МУХА ЦІП-ТОП!



у мой бок кампліменты: што я такая вядомая ў школе! Гэтыя словы мяне вельмі ўзрадавалі. Пасля „сустрэліся” мы на „асьцы”. Таму ў гэты вечар я размаўляла адначасова з Матфеем, Іонашам і Петрусём. Праўда, я ледзь паспявала пісаць да трох асоб нараз! Хаця гэта не была найбольшая праблема. Хлопцы запрашалі мяне на рандэву: Матфей запрасіў у кіно, Іонаш — у піцэрыю, а Пятрусь — на коўзанку. Я не ведала каго выбраць, з кім сустрэцца? Я баялася, каб хлопцы не даведаліся, што я вяду гутаркі не толькі з адной асобай.



## — (12) —

**Пасля агульнага сходу бацькоў мае сябры яшчэ доўга не маглі выходзіць з хаты. Але калі Соня запрасіла мяне, Ганку, Касю, Міколку і Ігара ў суботу на коўзанку, мы ўсе цешыліся.**

Я даўно ўжо не каталася на каньках і спачатку крыху баялася ісці з сябрамі. Але дзяўчаты і Міколка паабяцалі, што мяне падвучаць. Калі я апынулася на коўзанцы, усе мае сябры раптоўна зніклі з вачэй і я асталася сама. Я была злосная, калі пабачыла іх па другім баку катка. Я стаяла як слуп і не ведала што рабіць. Пасля я неяк дабралася да борта і стала сама вучыцца. Я суцяшала сябе — калі што не атрымаецца, буду гаварыць што ў мяне „такі" стыль. Мне шанцавала...

Мая язда рассмяшыла незнаёмых хлопцаў, якія каталіся побач. Адзін з іх пад'ехаў да мяне і прапанаваў, што можа быць маім інструктарам. Я была ў шоку, але згадзілася. Пасля першага „ўрока" я ўжо неяк каталася. Хлапец, які мяне вучыў, вельмі мне падабаўся. Называўся Максім. Пасля я пазнаёміла яго з Ганкай, Соняй, Касяй і Міколкам. З Ігарам не было патрэбы, высветлілася, што хлопцы — траюрадныя браты. Калі Ганка з Міколкам ад'ехалі ў іншы бок, а Соня, Кася і Ігар пайшлі сесці на лаўку, я асталася з Максімам.

Не ведаю калі гэта сталася, але ён узяў мяне за руку і мы так каталіся цераз доўгі час. У пэўны момант мы апынуліся па другім баку катка. І там... я пабачыла групу моладзі з маёй гімназіі. Быў гэта Пятрусь з ІІ

# МУХА ЦІП-ТОП!



„а” , Іонаш і іх найлепшыя сяброўкі. Калі нашы вочы сустрэліся, я загадала Максіму ад'ехаць у іншае месца. Мне было сорамна перад Петрусём і Іонашам, бо калі яны запрашалі мяне на коўзанку, я выкручвалася як магла, гаварыла ім, што не люблю катацца. Ну, а цяпер я шалела з нейкім хлопцам! І што яны цяпер пра мяне падумаюць? Пасля катка Максім папрасіў у мяне нумар „аські”. Я не магла дачакацца калі сяду ў хаце за камп'ютэр і буду з ім гаварыць. На жаль, калі я вярнулася дадому, даведалася ад таты, што мой малодшы брат папсаваў мой камп'ютэр. Ён засунуў у дыскавод лісток сыру.



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (13) —**

**Перад святочнымі канікуламі наша выхавацелька наладзіла Куццю. Тыдзень да гэтай сустрэчы Соня пачала збіраць у класе складчыну на святочнае застолле.**

На жаль, ніхто не хацеў прынесці грошы, на якія мы раней дамовіліся з Аўрэліяй. Два дні да Куцці грошы прынеслі Марта, Ксеня, Паўл, Матфейка і я. Апрача нас не было больш ахвотных, кожны круціў як мог, маўляў, што збяднее з-за гэтых дробных грашакоў. І паабяцалі, што не будуць есці з намі Куцці. Аўрэлія знервавалася гэтай партызаншчынай, яна таксама сказала, што да святочнай вячэры сядуць адно тыя вучні, якія не паскупілі пяці злотых на яду. Усе яе разумелі, ніхто нават не пратэставаў, не абураўся.

На пачатку мы падзяліліся аплаткай і просвірай. Гэтая ўрачыстая хвіліна мінула як міг, ніхто не пастараўся нават прыдумаць каларытных пажаданняў, усе паўтарылі адно: *З Калядамі!*

Марта, якая ходзіць у музычную школу, пачала іграць на скрыпцы. Аднак Міколка і Ігар стараліся перакрычаць яе ігру. Яны крычалі абы-што, каб толькі ўчыніць закалот. У той самы час, тыя што заплацілі складчыну, елі аладкі і салодкія пірагі, якія купіла (за сабраныя грошы) Соня. Гэта была вельмі смешная карцінка, шэсць асоб сядзела сабе за сталом, а апошнія — строілі з нас жарты! У пэўны момант Аўрэлія, Ксеня і Кася перайшлі ў другі канец залы, каб там слухаць ігры на скрыпцы. Міколка толькі чакаў такога, ён дарваўся да стала, ды загарнуў у свае кішэні цукеркі. Ён таксама са-

# МУХА ЦІП-ТОП!



браў мандарыны і пачаў імі раскідвацца па класе. Ігар выліваў сок, а мы з Ганкай і Матфейкам рабілі мікстуру: да аранжавага соку мы далівалі кока-колу і кідалі туды цукеркі. Міколка нават пачаў гэта піць, але калі пакаштаваў кактэйль, раздумаўся. Наша выхавацелька ўвогуле не хвалявалася. Яна прыкідвалася быццам нічога не бачыць...

І ўсё было б як належыць... Аднак, пяць хвілін да званка ў наш клас зайшоў настаўнік рэлігіі. Нягарчук прыйшоў да нас спытацца чаму ніхто з нашага класа не прыходзіць на ўрокі рэлігіі. Калі Нягарчук пабачыў нашае пекла, ён толькі схапіўся за галаву і выйшаў без слова. Аўрэлія выбегла за ім, яна пачала прасіць, каб той не гаварыў пра нашу Куццю спадарыні Воўк.

Тады мы сапраўды напалохаліся! Мы ўміг прыбралі залу, дружна заселі ўсім класам за стол і сталі спяваць калядкі...

Мы баяліся, што калі спадарыня Воўк наведае наш клас, яна напэўна выкіне нашу выхавацельку з працы, а нас „перамяшае” з нейкім іншым класам. А такога я б не перажыла.



— (14) —

**Мама не хацела мяне пусціць на дыскатэку, яна дакарала мне тройкай па інфарматыцы. Але пасля абеду ў яе паправіўся гумар і яна сказала: „Ідзі!”**

З майго класа прыйшло толькі шэсць асоб: я, Соня, Ганка, Міколка, Ігар, Матфейка. Дыскатэка пачалася ў семнаццаць гадзін, яе наладзілі ў нашай спартыўнай зале. Перад школай дырэктарка выставіла ахову, якая правярала ці вучні не ўносяць з сабой наркотыкаў, гарэлкі і цыгарэтаў. Падумаеце, смешная справа! Не. Ім нават пашанцавала злавіць трох жулікаў з першага класа. Хлопцы хацелі ўнесці з сабой пачак цыгарэтаў. Іх адразу завалаклі ў кабінет спадарыні Воўк. Мы пасля здзіўляліся, што ахоўнікі не абшукалі Міколку і Ігара. Хлопцы схітрылі, яны схавалі ў боты антызапорныя таблеткі, якія пасля ўкінулі ў сок, падрыхтаваны вучням дырэкцыяй.

Пасля гадзіны забавы многія пабеглі ў прыбіральню. Перад туалетам выстраілася доўгая чарга. Паркет цалкам апусцеў. Я не ведала што дзеецца. Я не піла соку. Мая сяброўка Соня, на жаль, напілася. Пасля яна або сядзела ў кабінцы, або стаяла ў чарзе да яе. Міколка з Ігарам таксама стаялі з усімі і жартавалі. Казалі, што на школу нахлынула нейкая эпідэмія. Але спадарыня Воўк не спала. Яна загадала ахоўнікам яшчэ раз абшукаць заплечнікі вучняў. Тыя ператрэслі ўсе заплечнікі і кішэні, аж знайшлі пусты пакет з-пад таблетак ад запору. Яны валяліся на падлозе ў распраналцы.

— Давайце сюды Міколку, — сказала Воўк.

# МУХА ЦІП-ТОП!



Яна ўхапіла жуліка за каптур і павалакла ў свой кабінет. Ззаду бег настаўнік фізкультуры. Ляскоўскі не мог дараваць жуліку жартаў у Інтэрнэце. Цяпер была нагода адпомсціць.



Пад уплывам рашучага дзеяння кадраў мы акрыялі і зноў пачалі танчыць. Усе былі злосныя на Міколку і Ігара. Першы, падвергнуты мучэннем, да ўсяго прызнаўся. Ды яшчэ „ўкапаў" Ігара. Хлопцы з трэцяга класа нават дамовіліся, каб збіць Міколку. Ну, але хто нармальны захоча біцца з Міколкам? Хлапчук, які ўвесь час сядзіць на панадворку, так добра б'ецца, што нават старэйшыя баяцца яго чапаць.

З другога боку не было магчымасці адпомсціць. Канікулы Міколка зрабіў сабе два тыдні да зімовых канікулаў. А пасля месяца ўсё разышлося кругамі па вадзе.

## — (15) —

**Надышоў момант, калі настаўнікі сталі падводзіць вынікі першага паўгоддзя і ставіць нам адзнакі. У мяне рыхтавалася тройка па інфарматыцы. І яшчэ, настаўніца нямецкай мовы загадала зрабіць мне плакат, інакш, гаварыла, не атрымаецца чацвёрка. З серады на чацвер я ўсю ноч малявала патрэбную афішу.**

Міколку, каб атрымаць двойкі па матэматыцы, англійскай мове, біялогіі, хіміі, фізіцы, інфарматыцы трэба было зрабіць шэсць плакатаў, два альбомы, напісаць чатыры справаздачы. Хлапчук зрабіў толькі адзін плакат па біялогіі. На іншыя прапановы яму не хапіла ўжо цярплівасці. Ён не хваляваўся, бо і так ніхто не мог выкінуць яго з нашай школы. Тут у яго прапіска. Адно, што маглі зрабіць, дык пакінуць Міколку на другі год у тым самым класе.

Сёння на ўроку Аўрэлія прачытала нам ацэнкі за паводзіны. Нікога не здзіўляла ацэнка Міколкі. На 200 балаў за цэлае паўгоддзе ён набраў толькі 3! Таму выхавацелька была вымушана паставіць яму адзінку. Не лепш было з найлепшым сябрам Міколкі — Ігарам, які набраў 7 балаў. Мы думалі, што гэта ўжо канец гэтай чорнай серыі, аднак Аўрэлія мела ў сваім спіску яшчэ адну асобу. Гэта была мая вельмі добрая сяброўка — Кася! Яе якраз не было ў школе, яна хварэла. Усе вучні былі ў шоку. Так гэта, быў шок! Бо Кася — спакойная асоба.

— Чаму? — пыталіся мы хорам. Але Аўрэлія не адказала на пытанне, яна далей чытала свой спісак: Бася Муха — „чатыры”,


$H_2O+SO_2$

Ганна Генюш — „чатыры", Соня Квяткоўская — „чатыры"...

Спачатку мы думалі, што так, як Кася, мы таксама атрымаем адзінкі. Але мы ўсчалі крык. Мы патрабавалі, каб выхавацелька растлумачыла нам, чаму ў Касі атрымалася адзінка.

— У яе многа неапраўданых адсутнасцей, — сказала Аўрэлія.

І тады за Касяй заступіўся наш Міколка:

— Як гэта так, — знерваваўся хлапчук, — я штодня сваволю на ўроках і перашкаджаю ўсім настаўнікам, дрэнна сябе паводжу на перыпынках, і ў Касі такая ж самая ацэнка, як у мяне? Гэта несправядліва, тым больш, што вы вырашаеце пра нашу сяброўку, калі яна хворая і сама не можа апраўдацца. Не — гэта не так! Я не пагаджаюся з вашымі баламі...

У класе запанавала доўгае маўчанне. Мы ўсе пагаджаліся з Міколкам.

— Ну, добра, — сказала Аўрэлія, — я пазваню бацькам Касі, хай патлумачаць яе адсутнасць.

Тут мы адчулі палёгку...

На доўгім перапынку я, Соня і Ганка хуценька зрабілі Міколку ўсе патрэбныя плакаты і справаздачы. Мы хацелі, каб ён вучыўся з намі ў класе надалей.

У першым паўгоддзі ў Міколкі атрымаецца такая вось сярэдняя ацэнка на паводзінах: 2,00.

## — (16) —

**У першыя дні зімовых канікул я не магла адаспацца. Апошнія два тыдні перад канцом першага паўгоддзя я лягала спаць пасля поўначы.**

Раніцай падымалася ў шэсць гадзін і паўтарала яшчэ раз засвоены матэрыял. Мае ацэнкі ўсё ж не задаволілі бацькоў, яны забаранілі мне сустракацца з сябрамі, асабліва з Міколкам ды Ігарам.

Зімовыя канікулы я прывітала ў сумным настроі. Бацькі адправілі мяне да бабулі ў вёску. Я не пратэставала. Наадварот, там у мяне сяброўкі — Віялета і Марта. У бабулі я магу рабіць усё што мне спадабаецца. Летам я езджу на ровары і купаюся ў возеры, зімой хаджу на лыжах, катаюся на каньках або гляджу тэлевізар. Ужо першага дня я пазваніла дзяўчатам:

— Як добра, што ты прыехала, — сказала Марта, — заўтра ў нашага сябры дзень нараджэння. Мы забярэм цябе з сабой. Напэўна будзе весела...

Спачатку я адмаўлялася. Мне не хацелася заводзіць новыя знаёмствы, але бабуля таксама мяне заахвочвала.

— Ідзі, — сказала, — я ў тваім узросце ўжо на танцы хадзіла.

Раніцай я прачнулася ў знакамітым гумары. За акном было бела, якраз уначы выпаў першы снег. У дзесяць гадзін раніцы за мною прыйшлі дзяўчаты. Я хуценька апранулася і мы пайшлі ў суседнюю вёску. Па дарозе я апавядала пра хлапцоў з нашай гімназіі, дзяўчаты — пра сваіх Цягам гадзіны мы прайшлі пяць кіламетраў, але мы нават не заўважалі як гэты час нам зляцеў.



— Як добра што вы прыйшлі! — прывітала нас мама Адася, сённяшняга юбіляра. Хлопец таксама выйшаў да нас на парог і з захапленнем глянуў на нашу тройку.

— Знаёмцеся, — сказала Віялета.

— Я Бася Муха, — усміхнулася я.

— А я, — хлопец пацiснуў мне руку, — Адам Казлоўскі.

У пакоі было многа моладзі. Гімназісты пілі кока-колу і ўспаміналі сваіх настаўнікаў. Найбольш нейкага *„Нішчыцеля”*, які паставіў у класе аж сем адзінак.

— А ў вас ёсць такія індывіды? — спытаў мяне Адам.

Я толькі чакала гэтага выкліку. Кампанію найбольш зацікавіў наш Міколка.

— Давайце напішам яму эсэмэску! — прапанавала Віялета.

Яна першая набрала нумар жуліка і напісала яму прывітанні і некалькі мілых слоўцаў. Міколка адразу адпісаў, ён дамовіўся з нашай сяброўкай яшчэ ў той самы дзень сустрэцца на катку. *Прыйдзі з сяброўкай*, — напісаў ёй.

Ад смеху нам разбалелі жываты. Мы ўяўлялі як Міколка і Ігар выглядаюць дзяўчат у Беластоку, а мы сабе гуляем дзвесце кіламетараў далей...



# МУХА ЦІП-ТОП!

## — (17) —

**Два дні пасля дня нараджэння Адася я даведалася ад самога гаспадара гэтай імпрэзы, што пакінула там рукавічкі. Адась напісаў мне эсэмэску і прапанаваў, каб мы сустрэліся. Хлопец вельмі мне падабаўся, таму пасля яго званка я ад радасці скакала па ўсёй бабулінай хаце.**

Я хуценька паведаміла мае сяброўкі, прасіла ў іх дапамогі. Віялета з Мартай згадзіліся схадзіць са мной у вёску Адама. Разам мы абдумалі план майго рандэву: у той час, калі я буду гаварыць з хлопцам, яны пойдуць да Ані, класнай сяброўкі...

Наступнай раніцы я прачнулася ў пяць гадзін. Памыла галаву, падмалявалася, выпрастала валасы і надзела найлепшыя апранахі. У сем гадзін я паснедала, пасля памыла зубы. Усе сваякі пыталі: „А дзе ж ты так выстраілася?" Я не хацела ім гаварыць пра Адася:

— Дзяўчатам трэба ў бібліятэку — зманіла я.

Перад восьмай гадзінай мы з Віялетай і Мартай выйшлі з хаты маёй бабулі. Да вёскі, у якой жыве Адам, мы ішлі няпоўную гадзіну. Ён ужо чакаў нас у вясковай краме. Дзяўчаты, згодна з планам, наведалі Аню, а мы з Адамам пайшлі на шпацыр. Мы хадзілі па вёсцы і гаварылі пра школу, пра сяброў, пра зоркі і планету Сатурн. Я даведалася, што мой новы знаёмы з'яўляецца сябрам нашага Матвейкі, яны разам пабывалі на летніку. Ну, а рукавіцы, якія прынёс мне Адам... не былі мае! Яны былі завялікія. Пасля Адам прызнаўся, што рукавіцы былі толькі зачэпкай для таго, каб нам яшчэ сустрэцца. Нягледзячы на тое, што мне было холадна ў рукі, я цешылася,



бо хлапец мне вельмі падабаўся. Пасля ён аддаў мне свае рукавіцы, яны добра пасавалі да маёй рукі і пальцаў.

Мы шпацыравалі мо з дзве гадзіны, аж падышлі да нас дзяўчаты і папрасілі, каб вяртацца дамоў. З Адамам я дамовілася на пятніцу. Ён паабяцаў, што прыйдзе ў вёску маёй бабулі. У паваротнай дарозе Віялета і Марта павіншавалі мяне. Адась быў найлепшым вучнем у іх школе (і самым высокім хлопцам). Ён гаварыў, што ў жыцці хоча стаць астранаўтам або спартсменам. Мы жартавалі, смяяліся, пляткавалі пра ўсіх мясцовых хлопцаў.

Раптам пачуўся гул машыны. У наш бок ехала аўто. Гэта быў Марк, маё першае каханне, у якім я закахалася, калі мне было два годзікі. Марк абагнаў нас і нават не спыніўся, быццам і не заўважыў нас. Гэта, вядома, узбурыла нас, а найбольш мяне.



## — (18) —

**Пасля сустрэчы з Маркам мы былі злосныя і таму ўсю зваротную дарогу вешалі на ім сабак. І дакаралі сябе: навошта ўсё дзяцінства мы дражніліся з ім? А зараз ён крыўдуе, не хоча нас ведаць?**

— Што праўда, то праўда, — пагадзілася Віялета, — не было ў нас такога лета, каб мы з яго не смяяліся.

— Усё ж такі... мог бы нас падабраць з дарогі, — перабіла Марта, — а то прыкінуўся, быццам і не заўважыў! Я пра ўсё раскажу Паўліне. Хай папракне свайго дзядзьку.

— А хто гэта тая Паўліна? — спытала я.

— Яна жыве ў Альшанцы і вучыцца ў нашай школе. А яе мама — старэйшая сястра Марка. Паўліна і зараз пабывае ў бабулі, значыць, у хаце Марка. Калі хочаш, — спытала мяне Віялета, — мы пазнаёмім вас з сабой.

— Вядома, хачу, — адказала я, але...

— Вось і яна! — усклікнула Марта. — Прыйшла эсэмэска ад Паўліны. Яна піша, што Марк нас бачыў на дарозе, як мы ішлі ў краму.

— Вельмі смешнае, — абурылася я, — жартачкі з нас строіць. Мы ж вярталіся з крамы... Напішы гэтай Паўліне, каб падзякавала дзядзьку.

У хаце мы расказалі пра ўсё бабулі, нашай размове прыслухоўваўся сусед Віця. Мы добра ведалі, што гэты чалавек, калі пра нешта пачуе, дык на другі дзень пра „тайну" гаворыць уся вёска.

На другі дзень я, Віялета і Марта запрасілі да сябе Паўліну. Калі дзяўчына даведалася, што я была калісьць закаханая ў яе дзядзьку (Марку зараз 18 гадоў), ледзь не



лопнула ад смеху. Мы расказалі ёй пра ўсе прыгоды, ды не забыліся і пра ўчарашні дзень.

— Марк просіць у вас прабачэння, ён падумаў, што вы ідзяце ў іншы бок, — сказала Паўліна. — Ну, а ваш сусед Віця ўчора званіў у гэтай справе, ён размаўляў з Маркам больш за гадзіну.

— Што? — я была ў шоку.

— Гэта магчыма, — пагадзілася Віялета, — Віця ўчора званіў маёй маме. Ён трымаў яе ля мабільніка аж 35 хвілін!

— Ён нармальны, — спытала я, — гэта ж усё каштуе?

— Тут справа ў іншым, — Віялета махнула рукой, — Віця атрымаў ад фірмы 600 дармовых хвілін і цяпер звоніць да каго пападзе.

Вечарам мы правялі Паўліну пад яе хату. Яна запрасіла нас папіць гарбаты, але мы развіталіся і пайшлі ў свой бок. Аднак

штосьці на дапускала нас дадому. Каля хаты Ігната Шчужэўскага цікавала за намі зграя сабак. Мы пабаяліся ісці далей. Таксама не хацелі вяртацца да Паўліны, каб не сустрэцца з Маркам. Сабакі былі ўсё бліжэй і бліжэй. Не было рады — мы здаліся. Я напісала эсэмэску Паўліне, каб яна выйшла на панадворак.

— А што здарылася? — спытала яна.

— Сабакі дурнога Ігнася ўсюды бегаюць, — адказала Віялета. — Дапамажы нам. Страшна вяртацца.

— Ну, добра, — Паўліна зірнула на мяне, — папрашу свайго дзядзьку, каб ён вас адвёз.

— Не, не! — запратэставала я.

— Іду па яго! — Паўліна вымоўна глянула на мяне. І дадала: — Пэўна захоча навесці папраўку на вашы адносіны.

Я, Віялета і Марта нічога ўжо не гаварылі. Мы баяліся сустрэчы з Маркам. Але, калі мы ўжо ехалі на яго аўтамашыне, хлапец быў вельмі для нас мілы. На канец ён сказаў, каб пра ўсё мы паінфармавалі суседа Віцю.

— Тады часцей — хлапец зірнуў у мой бок — буду атрымоўваць тэлефонныя званкі!



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (19) —**

**Калі я, і мая сяброўка Ганка, даведаліся, што настаўніца мастацтва Ірэна Чарвяк чытае ўсе „валянцінкі” падрыхтаваныя вучнямі, мы моцна ўсхваляваліся.**

Спадарыня Чарвяк апекавалася школьнай поштай, якую наладзілі ў нашай гімназіі з нагоды Свята закаханых. Гэта была звычайная скрынка, якая стаяла на калідоры. Вучні кідалі ў яе лісты і падарункі сваім сімпатыям і сябрам. Мы з Ганкай таксама купілі падарункі нашым хлопцам: кілаграм цукру Міколку, ваўняныя шкарпэткі Ігару і новую камізэльку Сяргею. Усе падаркі мы палажылі ў скрынку-пошту і з нецярплівасцю чакалі „Валянцінак”. Аднак два дні да свята мы даведаліся, што спадарыня Чарвяк адкрывае ўсе пакеты з падарункамі, а рэчы, якія ёй не падабаюцца, выкідае ў сметніцу. Гэтая навіна вельмі ўзбударажыла моладзь і мы сталі збірацца пісаць ліст-пратэст абаронцу правоў дзіцяці. Каму як каму, а права на прыватную карэспандэнцыю для моладзі вельмі важнае. Як можна чытаць чужыя лісты!? Апрача гэтага Матвейка распусціў плётку, што быццам спадарыня Чарвяк у канцы працоўнага дня забірае скрынку дахаты і там разам са сваёй дачкой выбіраюць сабе найлепшыя падарункі. А тыя, якія не падабаюцца маладой Чарвячанцы, выкідаюць.

Праўда, тое што расказвае Матвейка, не заўсёды праўда. Але пад уплывам пачутага мы адразу пабеглі да спадарыні Воўк. Дырэктарка не давярала нам і калі мы расказвалі пра свае праблемы, яна іранічна ўсміхалася.

# МУХА ЦІП-ТОП!



— У вас заўсёды такія дурныя думкі! — крыкнула жанчына. — Як увогуле можна так думаць пра настаўнікаў?! Давайце больш не будзем гаварыць пра такія пусцякі. Лепш падумайце пра свае ацэнкі. Да пабачэння!

Пасля візіту ў кабінеце спадарыні Воўк мы адчувалі сябе прыгнечанымі. Мы ўсё думалі пра спадарыню Чарвяк і яе дачку. Мы ж не куплялі новай камізэлькі для яе. Яна нават не ў змозе скеміць, што гэта сяброўскі жарт зразумелы толькі ў нашым класе. Мы таксама памяталі, што ў пачатковай школе ніхто не правяраў нашых „валянцінак”, а тым больш — не аддаваў іх сваёй сям’і.

У Дзень закаханых мы не маглі думаць пра навуку. Усе чакалі пошты. Аднак вучні III класа, якія разносілі „валянцінкі”, прыйшлі ў наш клас ажно на чацвёртым уроку. У мяне і ў Ганкі былі вельмі заклапочаныя міны, калі нашы сябры, Ігар і Сяргей, атрымалі пакецікі. Ігар хіхікаў, Сяргей пайшоў у прыбіральню. А што сталася з пасылкай Міколкі? Праўда, падобны пакет з цукрам мы бачылі ў час доўгага перапынку. Ён стаяў на настаўніцкім стале ў сталовай, а наша апякунка пошты, спадарыня Чарвяк, саладзіла ім сваю каву.



## — (20) —

**Пра Свята закаханых забываюць ужо на другі дзень, але ў нашай школе было інакш. Тыдзень пасля „Валянцінак” у нас адбыўся дэкламатарскі конкурс, дзе вучні выступалі з вершамі пра каханне.**

Праўда, пачаткова ён меў адбыцца 14 лютага, але ў той час захварэла галоўная арганізатарка, спадарыня Шум і конкурс адтэрмінавалі. Спачатку я не хацела прымаць у ім удзелу, але спадарыня Шум сказала, што кожны ўдзельнік атрымае шасцёрку па польскай мове.

Як не цяжка дадумацца, ахвотных было хоць адбаўляй! З нашага класа ўсе як адзін прыступілі да конкурсу, нават Міколка. Гэты апошні ніколі раней не ангажаваўся ў такія справы, наадварот, ён толькі высмейваў усе школьныя конкурсы і тэатры. Дражніўся на перапынках, хіхікаў, прызываў няўдалых „акцёраў”. Гэта з-за яго многім адхацелася ісці ў акцёры” (няма як добрая порцыя крытыкі!).

У гэты раз, калі Міколка заявіў сваю прысутнасць, мы сталі рагатаць, бо ўсе спадзяваліся, што ён прыдумае нейкае „шоу”.

Так ці інакш, хвароба спадарыні Шум астудзіла наш запал і спадзяванні. Многія ўвогуле забыліся пра конкурс. Прыгадалі пра яго ў дзень, калі настаўніца вярнулася ў школу і ад рання, разам з трэцякласнікамі, сталі рыхтаваць святліцу да мерапрыемства.

Мы таксама сталі рыхтавацца. Большасць з нас толькі сёння ўспомніла пра конкурс і пачала „дзейнічаць”. Я, Ганка, Соня, Кася,


Конкурс
Дэкламатарскі

Міколка, Ігар, Сяргей і Матвейка паперлі на першым перапынку ў бібліятэку. Мы хапалі з паліцы выпадковыя вершы і глядзелі ці выступае ў іх слова „каханне”.

— Лепш скажыце сваю любімую песню вершам, — параіла Аўрэлія, якая таксама была ў бібліятэцы.

Гэтая ідэя мне спадабалася і я на ўроку хіміі, замест думаць пра прадмет і задачы, прыгадвала сабе песню пра каханне. Аднак паказалася, што я не ведаю ніводнай такой песні. Тыя ўсе, якія мы часам спяваем з дзяўчатамі на перапынку, былі пра... Менавіта — пра што яны? Я думала і не магла нічога прыдумаць. Ганка таксама „змагалася”, яна зубрыла нейкі верш з падручніка па літаратуры, які выпадкова ёй адкрыўся і не быў доўгі. Міколка шмараваў нейкія кветкі і сэрцайкі на лістку паперы і я падумала, што ён сучасны „паэт”. Пад уплывам гэтай смешнай сцэны я ўлавіла ідэю. Так, я ведала ўжо як мне выступіць на сцэне.

У дзень конкурсу, здавалася, у нашай школе былі адны кандыдаты ў акцёры і дыктары. Да конкурсу прыступіла аж 90 асоб з другіх класаў. Прыблізна столькі ж ахвотных было і ў іншых класах. Каб хутчэй праслухаць усіх удзельнікаў, нас раздзялілі на шэсць груп ды размясцілі ў розныя класы. Я папала ў самую прэстыжную групу. Нас ацэньвала журы ў саставе: спадарыня Воўк, наша Аўрэлія і акцёр гарадскога тэатра, спадар Кропка. Гэты апошні наводзіў вялікі канфуз, калі гімназісты кляпалі свае вершы, ён або смяяўся ўголас або дэманстратыўна пазяхаў. Некаторыя ўвогуле не выступілі, у тым ліку наш Міколка, з якога мы мелі ахвоту пасмяяцца.

Я выступіла апошняй. У час маёй дэкламацыі нават запанавала цішыня, і я адчува-

ла, што ўсё ідзе як найлепш. І сапраўды, я апынулася сярод лаўрэатаў. Аднак камісія не ведала каму прызначыць першае месца — мне ці маёй сяброўцы Соні. Члены камісіі папрасілі нас яшчэ раз прадэкламаваць свае вершы. Соня, вядома, прадэкламавала.




Я не магла паўтарыць свайго верша, бо гэта была мая аўтарская імправізацыя (якой я на хаду прыдумала аўтара і цяпер не патрапіла паўтарыць яго прозвішча). І хоць спадар Кропка назваў мяне „Мухай ціп-топ", Воўк прапанавала дыскваліфікаваць мяне.

— Гэта нязгодна прынцыпам конкурсу, — у дырэктаркі склалася прыкрае ўражанне ад майго творчага палёту і яна патрабавала ўляпіць мне адзінку. На шчасце спадарыня Шум даказала, што арганізатары не прадбачылі кары дэкламатарам!

## — (21) —

**У мінулую сераду Аўрэлія сказала, што ў наступным тыдні наш клас пойдзе на сустрэчу з паэтам Янам Дышкевічам. Большасць маіх сяброў не чула пра гэтага літаратара, але ўсе вельмі цешыліся, што не будзе заняткаў.**

Спадарыня Воўк паклікала мяне і Ганку ў свой кабінет і сказала, каб мы падрыхтавалі вершы Дышкевіча ды выступілі ў час сустрэчы. Прапанова дырэктаркі вельмі нас здзівіла. Ці спадарыня Воўк забылася пра нашае выступленне на ўрачыстай лінейцы з нагоды Свята незалежнасці?

У аўторак, з самой раніцы, мы паехалі аўтобусам у Гімназію н-р 16. Аўрэлія забылася праверыць нашы білеты. І якраз на адным з прыпынкаў увайшлі кантралёры. Міколка, Ігар, Паўл і Соня ехалі зайцам. Каб не плаціць кары, два першыя хлопцы выскачылі з аўтобуса на першым прыпынку. Паўл стаў прыкідвацца, што спіць. Соня схавалася за нейкім высокім дзядзькам, каб кантралёр яе не прыкмеціў. На шчасце Аўрэлія не заўважыла непрысутнасці хлопцаў, і мы спакойна даехалі на месца. Міколка і Ігар былі ў гімназіі перад намі. Яны прыйшлі сюды напрасткі. Калі мы ішлі ў залу, дзе мела адбыцца сустрэча з паэтам, я пабачыла знаёмыя асобы: Марціна Дзеда, Еву Галіноўскую і Тамаша Місеюка з майго раёна. Гэтых вучняў выкінулі з іншых школ за дрэнныя паводзіны, спрэчны з патрабаваннем касцюм, смакавыя рэчывы і дрэнныя ацэнкі.

— Калі будзеш такая як яны, — сказала Ганка, — таксама будзеш тут вучыцца.

## МУХА ЦІП-ТОП!



— Чаму тут? — спытала Соня.

— Бо тут у мяне прапіска, — адказала я, — жыву дзве вуліцы далей ад гэтай школы.

Мы спынілі гутарку, бо ў залу ўвайшоў Ян Дышкевіч. Паэт стаў расказваць пра сваё жыццё і творчасць. Спачатку я думала, што засну. Але разбудзіў мяне гук гітары… Што? Так, гэта Марцін Дзед і ягоны гурт „Марамур” выйшаў на сцэну і пачаў свой выступ. Цяпер мне хацелася *гніць*! Я не спадзявалася, што такі жулік, як Марцін, можа мець свой гурт і так прыгожа спяваць ды іграць на гітары. Мы пачулі ў яго выкананні пяць песень на словы Яна Дышкевіча. Пасля прыйшла пара на мяне і Ганку. Аўрэлія загадала нам выйсці на сярэдзіну залы і прадэкламаваць верш. Літаратар быў захоплены, што моладзь спявае і дэкламуе ягоныя творы…

Я баялася аднаго. Напэўна Марцін Дзед будзе хіхікаць з мяне або дакучаць, калі я сустрэну яго з сябрамі каля свайго дому. На шчасце я не памылілася ні разу і не напаў на мяне дурны смех. Гэтага я найбольш баялася і на ўсялякі выпадак у час выступлення глядзела на белую сцяну.

Рассмяшыў мяне толькі паэт. Калі я закончыла сваю дэкламацыю, Ян Дышкевіч падышоў да мяне і пацалаваў мяне ў руку.

— Уооооў! — завыла публіка.

Я пачырванела як бурак.



## — (22) —

**Пасля сустрэчы з паэтам Янам Дышкевічам мы вярталіся аўтобусам. Хлопцы былі вельмі разбуджаныя. Яны бегалі па ўсім аўтобусе і крычалі нейкія дурноты.**

Гэта знервавала нашу выхавацельку Аўрэлію. Жанчына спрабавала супакоіць хлопцаў, але яны яе не слухалі і яшчэ больш балаганілі.

Калі пра ўсё даведалася спадарыня Воўк, яна забараніла нашаму класу ісці ў кіно ў Першы дзень вясны. Усе дзяўчаты, разам з Матвейкам, які як адзіны з хлопцаў быў паслухмяны, пакрыўдзіліся на Міколку, Ігара, Паўла і іншых. Мы не хацелі правесці гэты незвычайны дзень у школе! Пайшлі мы нават да спадарыні Воўк прасіць, каб яна прыдумала нам нейкую іншую кару. На жаль, дырэктарка нас не любіць. Яна нават не хацела да канца выслухаць нашу просьбу. Сказала, што за паводзіны нашых хлопцаў мы ЎСЕ адказныя, бо не аказалі на іх добрага ўплыву, не прамовілі ім да розуму і напэўна самі іх правакавалі да такіх неадказных паводзін...

21 сакавіка на ўрокі ў пустую школу прыйшло толькі 9 вучняў з найгоршага III „г” класа. Хлопцы, так як і мы, „адраблялі” кару. З нашага класа прыйшло 13 дзяўчат і Матвейка. А тыя, што насвавалілі, зусім не паявіліся. Яны і не думалі пра школу. Міколка напісаў мне эсэмэску, што ён з хлопцамі ўжо на коўзанцы. Пасля інфармаваў мяне, што пойдуць у парк на марожанае. Такая вестка вельмі мяне знервавала. Чаму такі Міколка, які найбольш набалаганіў, катаецца сабе на коўзанцы, а мы сядзім на


Увага!
21.03.2007
7

ўроку і ад хвалявання не можам сабраць сваіх думак?

Перапынкі напаміналі нейкую паніхіду. У школе было нудна і ціха. Адны жулікі з трэцяга „г" ганяліся па калідоры і нешта майстравалі. З-за таго, што сёння не было большасці настаўнікаў, яны павывалакалі з кабінетаў дошкі, паставілі іх на калідоры і сталі шмараваць шаржы настаўнікаў і дырэкцыі. Наколькі іх мастацкі хэпенінг быў пазбаўлены таленту і гумару, мы праігнаравалі іх творчасць. Аднак яны не давалі нам спакою і рабілі ўсё, каб звярнуць на сябе ўвагу. Невядома калі яны ўварваліся ў распраналку і памяшалі тапці асоб з іншых класаў. Я знайшла свае тапачкі ў мяшку Сяргея, а ў сваім — тапці Алёшы з ІІ „д"!

Апошні ўрок быў найгоршы з магчымых. Вёў яго наш любімы настаўнік Нягарчук. Ён рэдка бывае ў нашай школе, але, нягледзячы на сваю непрысутнасць, ён запісвае ў журнале тэму і адзначае нашу „прысутнасць". Сёння таксама, хаця ў школе не было 90 працэнт вучняў, ён не пазначыў ні адной непрысутнасці. Мы, вядома, абурыліся, казалі, што толькі сляпы не прыкмеціў бы, што школа пустая і нікога няма.

— Ага, — падхапіў апошняе слова Нягарчук, — значыць, вас таксама няма!

І нягледзячы, што мы гжэчна сядзелі за першай партай, ён уляпіў нам непрысутнасць.



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (23) —**

**Ігар ад месяца, амаль бесперапынна, расказваў нам пра фільм, у якім ён з сябрамі ездзіць на скейце. У мінулы чацвер адбылася прэм'ера гэтага фільма, на якую я і пару асоб з нашага класа атрымалі запрашэнне.**

Спачатку бацькі баяліся пусціць мяне на прэм'еру, бо яна мела адбыцца вечарам, у пабе. На шчасце мая мама дамовілася з мамай Ганкі, каб тая пасля сустрэчы, *адставіла* мяне дахаты.

Сустрэча праходзіла ў пабе „Лофт". Калі мы ўвайшлі ўсярэдзіну, крыху спалохаліся. Там былі амаль адны ліцэісты! Двух хлопцаў было настолькі высокіх, што нам здавалася датыкаюць яны галовамі да столі. Усе людзі, якія былі ў пабе, мелі на сабе вельмі вузкія штаны, скейтаўскія чаравікі і блюзы ў палоску. Было нават крыху дзяўчат. Мы з Ганкай не маглі знайсці Ігара. Нікога мы тут не ведалі і з-за таго нам было крыху няёмка.

— Цікава, што яны ўсе пра нас думаюць? — спалоханым голасам сказала Ганка.

— Пэўна ў шоку", што такія *гжэчныя* дзяўчаткі наведалі іх месца, — сказала я.

Раптам перад вачыма з'явілася *шапка* Ігара.

— Ганка, глянь! Там стаіць Ігар, ідзем да яго.

Наш сябар быў здзіўлены, калі нас пабачыў. Ён думаў, што бацькі пабаяцца пусціць нас на іхную прэм'еру. Калі мы селі за ягоным столікам, убачылі, што два высокія хлопцы ідуць у наш бок.

— Гэта мае найлепшыя сябры, — сказаў Ігар. — Знаёмцеся, гэта „Шчупак" — рэжысёр фільма і Адр'ян — адзін з галоўных герояў.



Мы з Ганкай пачалі размаўляць са „Шчупаком”.

— Як завецца ваша субкультура? — спытала мая сяброўка.

— Я сам *панк*, — сказаў Адр’ян, — вядома, езджу на скейце, аднак слухаю толькі гуртоў якія іграюць музыку *панк*.

— А мы заўсёды думалі, што скейты слухаюць рап, — сказала я.

— Я ўжо два гады не слухаю гэтага *бадзевя*, — абурыўся „Шчупак” і адышоў ад століка, бо нехта яго паклікаў. Мы пазнаёміліся яшчэ з нейкім дзіўным хлопцам у акулярах, які піў піва. Хлапец быў крыху старэйшы за нас, аднак не выглядаў на паўналетняга.

— З якой вы школы? — спытаў ён мяне і Ганку.

— З Гімназіі нумар 1, — адказала я.

— Там мая баба працуе дырэктаркай.

— А...

— Яна завецца Кіра Воўк, — сказаў хлапец і спакойна піў піва.

— Што?

Мы спачатку напалохаліся, а пасля хуценька памянялі столік. Мы ўяўлялі, як раптам у „Лофт” з’явіцца спадарыня Воўк і будзе крычаць на нас за тое, што мы не аказалі добрага ўплыву на яе *нягжэчнага* ўнука!



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (24) —**

**У пачатку красавіка наш школьны хор паехаў у Варшаву на конкурс хораў. З майго класа да хору належаць толькі я, Ганка, Марта і Матвейка. Хоць усе мы моцна хваляваліся, аднак вельмі цешыліся з паездкі ў сталіцу.**

Шкадавалі мы толькі, што разам з намі няма іншых сяброў з класа. Разам з хорам паехалі ў Варшаву таксама нашы настаўнікі: спадар Віталь Лісоўскі (ён вядзе наш хор), Аўрэлія, настаўнік фізікі спадар Віснеўскі і дырэктар школы Кіра Воўк.

У сталіцы мы доўга не маглі выгрузіцца з аўтобуса, бо наш шафёр не мог знайсці вольнай стаянкі. Аднак калі яму пашанцавала паставіць машыну на стаянку, мы адразу пайшлі ў філармонію. Спачатку мы баяліся спаборніцтва — з'ехаліся школьныя хоры з усёй краіны. Я думала, што пры такой канкурэнцыі ў нас няма шанцу на ўзнагароду. Аднак большасць гуртоў спявала не надта „чыста" і мы заваявалі… першае месца! У якасці ўзнагарод мы атрымалі кніжкі і 800 злотых. Спадарыня Воўк і Віталь Лісоўскі ганарыліся, што наша гімназія найлепшая ў краіне. У сувязі з перамогай яны прыдумалі нам яшчэ адзін прыз — завезлі нас у самы вялікі і сучасны гандлёвы цэнтр сталіцы.

— Маеце дзве гадзіны на свае справы, — сказала нам Аўрэлія.

Спачатку мы хадзілі па крамах. Мы з Ганкай купілі сабе кашулькі ў палоску, а наша сяброўка Ксеня — індыйскія завушніцы. Пасля гадзіны бадзяння па магазінах (яно хутка нам абрыдла!) мы зайшлі ў піцэрыю,



каб нешта перакусіць. І там мы пабачылі дзіўнага хлопца ў нашым узросце. У яго былі доўгія валасы, чорны плашч і чаравікі-*гляны*. А на галаве ружовы капялюш з блісcкучкамі. Мы папрасілі яго каб зрабіў з намі здымак. Мы хацелі гэтага фарсуна паказаць нашым сяброўкам — у нашым горадзе хлопцы так не апранаюцца.

Пасля яшчэ мы сустрэлі хлапца, які напамінаў нашага Міколку. Мы нават жартавалі, што наш сябра ўцёк са школы і самаспынам прыпёрся ў Варшаву — каб не быць горшым за нас!

Аднак знаёміцца з двайнікам Міколкі мы не мелі адвагі. Мы падумалі, што калі гэты хлопец мае такі характар як наш сябра, ён можа выкрасці нас на горад і мы не паспеем пасля вярнуцца на дамоўленую гадзіну. А тады спадарыня Воўк будзе мець зручную нагоду, каб выкінуць нас са школы.



# МУХА ЦІП-ТОП!

— (25) —

**Два тыдні да Вялікадня ў нашай школе адбылося гавенне. Настаўнік рэлігіі, спадар Нягарчук, сказаў, што на гэты раз ён дапільнуе кожнага паасобку і завядзе ўсіх нас да споведзі. Аднак у дзень, калі трэба было ісці ў царкву, ён увогуле не паказаўся ў школе. Большасць вучняў вярнулася дахаты або пайшла на прагул.**

Мы з Ганкай спачатку рушылі ў бок царквы, але і там мы не сустрэлі настаўніка рэлігіі. На панадворку было вельмі цёпла — як у чэрвені. Нам не хацелася вяртацца дамоў (Нягарчук сказаў, што сам мусіць пабачыць як мы падыходзім да споведзі, інакш ён паставіць нам мінусы!)

— Можа паедзем да мяне? — прапанавала Ганка, — у мяне няма нікога ў хаце!

Мая сяброўка жыве 6 кіламетраў за горадам. Спачатку мы не ведалі як дабрацца ў яе вёску.

— А можа будзе ехаць туды цяпер нейкі аўтобус *PKS*, або *Pogoda Express*? спытала я.

— Не, — адказала Ганка, — *PKS* будзе толькі праз дзве гадзіны, а *Pogoda* праз тры.

— А гарадскі транспарт туды ездзіць?

— Не, але мы можам паехаць на *19-ым* на апошні прыпынак і перайсці пяшком 4 кіламетры...

— А не лепш пад'ехаць самаспынам?

— Добрая думка, — уцешылася Ганка, — пайшлі тады на *19-ты!*

Праз першых дзесяць хвілін ніхто не спыніўся, каб нас падвезці. Калі мы ўжо хацелі вяртацца ў горад, перад намі затармазіла вельмі старая машына. Усярэдзіне сядзеў нейкі стары хіпі з доўгімі валасамі і барадой.



— Ці маглі б вы падвесці нас у Крынічкі?

— Сядайце! — сказаў.

У старэнькай машыне быў страшэнны балаган, а па радыё ляцеў нейкі гард-рок. Апрача гэтага наш шафёр курыў люльку. Я кусала сабе язык каб не ўспыхнуць дурным смехам, а Ганка глядзела ў акно.

Хіпі спыніўся ў Крынічках і пажадаў нам добрага дня.

Дзве гадзіны мы правялі ў хаце Ганкі, самі згатавалі сабе абед — сёння мы яшчэ нічога не елі. Каля трэцяй мы зноў выйшлі спыніць *аўтастоп*, нам трэба было вярнуцца ў горад. За гадзіну ў мяне пачыналіся заняткі ў музычнай школе, а ў Ганкі заняткі па англійскай мове.

На гэты раз мы не мелі праблем з самаспынам. Пасля пяці хвілін каля нас спынілася вельмі прыгожая машына.

— Калі ласка! — запрасіў нас усярэдзіну знаёмы голас.

— Што?!

Так, усярэдзіне сядзеў наш настаўнік рэлігіі, спадар Нягарчук.

— А чаму вы не на гавенні? — строга спытаў ён.

— Ы-ы, — пачала я, — бо мы вас не сустрэлі ў школе.

— Я чакаў вас у царкве, — сказаў Нягарчук.

— І мы там былі, — пачала Ганка, — толькі чамусьці вас там не бачылі...

— Немагчыма! — абурыўся Нягарчук.

— Але мы сапраўды там былі і вас шукалі! — дадала я.

— Відаць, размінуліся, — буркнуў Нягарчук.

Калі мы пакідалі яго машыну, настаўнік рэлігіі назначыў нам задачу. За кару мы мелі склікаць наш клас і яшчэ раз пайсці да споведзі.

— І каб ніхто мне не спазніўся! — строга загадаў Нягарчук.

# МУХА ЦІП-ТОП!

## — (26) —

**У апошні дзень навукі да велікоднага перапынку наша выхавацелька Аўрэлія прыдумала, што будзем маляваць яйкі. Усе мы вельмі цешыліся, а гэта абазначала, што сёння не будзем пісаць кантрольнай па біялогіі.**

Я села разам з Міколкам і пачала працу. Пасля пяці хвілін хлопцы пачалі сваволіць. Ігар намаляваў на сваім яйку спадара Нягарчука, а Матвейка — дырэктарку Кіру Воўк. Калі выхавацелька ўбачыла чым займаюцца хлопцы, забрала ў іх яйкі і сказала:

— Ну, што вы, хлопцы! Я думала падарыць вашы крашанкі настаўнікам ад усяго нашага класа. Ды нічога, намалюйце яшчэ новыя, а гэтымі абдаруйце сваіх бацькоў.

Ігар і Матвейка зусім не пераймаліся тым, што сказала Аўрэлія, і ў гэты раз намалявалі на яйках спадара Ляскоўскага з півам. Мо яны далей памятаюць яго старонку <www.byk26@fotka.pl>?

Дзесяць хвілін да канца ўрока Аўрэлія пайшла ў прыбіральню, а хлопцы пачалі кідацца яйкамі. Ігар трапіў проста ў сметніцу, Сяргей — у акварыум з чырвонымі рыбкамі. Клас смяяўся, толькі адзін Міколка сядзеў як мыш пад мятлой і старанна выводзіў ромбікі на сваім яйку. Найбольшы жулік у класе, відаць, перадумаў свае паводзіны пасля споведзі! Усе мае сябры былі ашарашаны. Хлапчук сядзеў ціха і нават не смяяўся з намі. У іншы раз ён першым крычаў бы і абкідаўся б усім чым папала.

На канец урока Міколка падышоў да выхавацелькі і папрасіў у яе прабачэння за свае ранейшыя паводзіны. Потым пажадаў Аўрэліі і яе сям'і здароўя і шчасцейка на Вялікдзень, а на перапынку схадзіў у бібліятэку і пазычыў кніжкі.



Што гэта ўсё мела значыць? Мы былі ў шоку і не ведалі што сказаць.

Набліжаўся Вялікдзень. Мы з Ганкай і Касяй пайшлі ў царкву на ўсяночную. Ад пачатку багаслужбы мы глядзелі на чатырох высокіх прыслужнікаў ды не верылі ў тое што бачым.

— Ці ты бачыш тое, што я бачу? — азвалася шэптам Ганка.

— А можа гэта нейкі двайнік? — прашаптала Кася.

— А можа сваяк? — сказала я.

Так, сярод прыслужнікаў быў хлопец з чорнымі валасамі пастаўленымі на гель, капля ў каплю як наш Міколка. Мы не ведалі што думаць, усё што дзеялася з нашым жулікам на працягу апошняга тыдня напаміналa нейкі цырк. І ці сапраўды гэта ён сам — а не яго двайнік? Другая версія была больш пераканаўчая — хоць не, мы памяталі апошні ўрок біялогіі і ўзорныя паводзіны Міколкі.

На перапынку мы выйшлі на царкоўны пляц і прыселі на лавачцы. Пахла вясной і свежай зеленню.

— Што яго так адмяніла? — гадала ўголас Ганка.

— А можа пабачыў д’ябала, напалохаўся і пакаяўся, — кінула Кася.

— А можа гэта чарговы фокус Міколкі? — я не здавалася. — Цяжка паверыць, што гэта той самы хлапец.

Праз некалькі хвілін мы пераканаліся, што чарнявы прыслужнік гэта сапраўды наш Міколка. Хлапец перайшоўся побач нас і прывітаўся па-царкоўнаму: *Хрыстос Уваскрос!*

Мы зноў перажылі шок і нават не адказалі яму як належыць, што *Сапраўды ўваскрос!* Наш сябра пайшоў проста на плябанію. Толькі праз некалькі хвілін мы ўсё зразумелі.

Міколка вяртаўся ў царкву разам з дачкой настаяцеля Марысяй.

# МУХА ЦІП-ТОП!

## — (27) —

**Тыдзень пасля Вялікадня зноў было прыгожае надвор'е. Я дамовілася з сябрамі на веласіпедную экскурсію па горадзе. Спачатку на гэтую прапанову адгукнуліся толькі тры асобы (я, Ганка і Матвейка), а пасля далучыліся яшчэ Ігар, Паўл, Кася і Соня.**

Міколка не хацеў з намі сустракацца, ён пайшоў у царкву. Праўду кажучы, нам ужо абрыд такі Міколка... З-за яго метамарфозы на ўроках зноў было нудотна. Вясною заўсёды няма ахвоты вучыцца, і ўсе мы найлепш уцяклі б на вясёлы прагул.

У суботу мы сустрэліся ў 12 гадзін у цэнтры горада. Першыя дзесяць хвілін мы ездзілі па тратуары, пасля пераехалі ў парк. Там было многа народу, многа моладзі на веласіпедах. Хлопцы ездзілі на скейце, шпацыравалі закаханыя парачкі. Каля будкі з марожаным мы сустрэлі Міколку з яго сімпатыяй — дачкой настаяцеля, Марысяй. Хлапец на прывітанне сказаў нам толькі „чэсць!" (нават да нас не падышоў). Мы ўжо самі хацелі падысці да іх і пазнаёміцца з дзяўчынай Міколкі.

Каля старога дуба мы пабачылі спадарыню Воўк з сямейкай. Быў там і яе ўнучак, якога мы з Ганкай сустрэлі на мерапрыемстве скейтаў. Але ён прыкідваўся быццам нас не ведае і быў горшы за нашага Міколку, бо нават не сказаў нам „чэсць!"

Пасля гадзіннай язды па парку мы паехалі ў бок заапарка. Там нас зачапіла здымачная група рэгіянальнага тэлебачання.

— Чаму вы ездзіце на веласіпедах? — спытаў журналіст.

— Бо ў парк не пускаюць на аўтамашы-


TV

не — пажартавала я. Мае сябры пачалі смяяцца, але яны не адважыліся выступіць перад тэлекамерай. Я, вядома, гаварыла і гаварыла. Даказвала як сучасная моладзь абажае спорт і ўсялякія актыўныя формы адпачынку:

— Вось зімой, — гаварыла я, — мы кожную вольную хвіліну прысвячаем катанню на каньках. Вясной адразу перасядаемся на ровары, а летам найахвотней плаваем і ходзім у далёкія вандроўкі.

— А што думаеце пра скейтаў? — спытаў журналіст.

Паколькі ў нашай кампаніі быў заўзяты скейт, мы сілком выпіхнулі Ігара перад тэлекамеру. Але наш сябра быў настолькі ўсхваляваны, што не сказаў ніводнага сэнсоўнага слова.

— А ці спартыўная актыўнасць не мяшае вам у вучобе? — спытаў на канец журналіст.

— Наадварот, — адрэзаў Матвейка, — усе мы выдатнікі.

— Дзякую за інтэрв'ю! — журналіст пажадаў нам вясёлай гульні. — Аглядайце сябе сёння ў 18 гадзін па нашым рэгіянальным тэлебачанні.

— А хто апрача нас яшчэ гаварыў пра веласіпеды і скейтаў? — спытаў Матвейка.

— Пабачыце самі, — заахвоціў нас журналіст...

У 18 гадзін я ўключыла тэлебачанне. Маё выказванне не было бліскучым, мы з Матвейкам гаварылі без складу і ладу, як маленькія дзеткі. Але настрой падняў мне чарговы кадр. Гэтае выказванне рассмяшыла і абурыла мяне.Перад тэлегледачамі выступіла знаёмая парачка — Міколка з Марысяй. Яны даказвалі, што веласіпедысты і скейты самы дзікі народ на свеце.

— Мала таго, што ездзяць як шалёныя і не

прыкмячаюць пешаходаў, — гаварыў Міколка, — дык яшчэ спецыяльна наязджаюць на закаханых, каб яны не шпацыравалі па парку трымаючыся за рукі.

І падумаць! Яшчэ два тыдні таму сам Міколка наязджаў на закаханых — гэтакі дзікі жарт нам ніколі не прыйшоў бы ў галаву.



## — (28) —

**У апошнія дні ў мяне было шмат вольнага часу, два тыдні мы не хадзілі ў школу. У гэты час трэцякласнікі пісалі тэст на заканчэнне гімназіі. Мае дзве сяброўкі, Ева і Оля, сталі лаўрэаткамі прадметнага конкурсу па беларускай мове.**

Яны мелі ўжо *заклепанае* месца ў кожным ліцэі. Я таксама ў гэтым годзе приступала да прадметнага конкурсу, але не надта пастаралася і ў канцы атрымаўся нецікавы эфект. Каб перайсці да раённага этапу, мне не хапіла аднаго бала.

У апошні уік-энд ніхто з трэцякласнікаў не выходзіў пакатацца на ровары, ніхто не выседжваў і не бегаў па парку. Нават брат Ігара, які зараз заняў месца нашага Міколкі — месца найбольшага жуліка ў школе, сядзеў у хаце і рашаў тэсты. А мы, другакласнікі, маглі рабіць усё, што толькі душа жадае. А душа хацела так многа! Таму з рання да вечара (а часам і пазней) мы бегалі па панадворку, хадзілі на басейн паплаваць або ішлі ў парк глядзець на скейтаў. Дні ляцелі-праміналі, а мы нават і не думалі заглядаць у кніжкі, тым больш, што набліжаўся ўжо канец школьнага года. Мы пазбягалі гутарак пра ацэнкі, паколькі гэтая тэма магла б папсаваць нам бестурботны, вясновы настрой.

А можа гэтак дзейнічаў прыклад „шчаслівых" лаўрэатак?

У гэты ж час, калі амаль усе трэцякласнікі сядзелі за кніжкай, мае сяброўкі-лаўрэаткі Ева і Оля думалі зусім пра іншае. Дзяўчаты зусім не хваляваліся як напішуць тэст. Яны думалі толькі пра адно, як апра-


1
2
3
4
Экзамен
1. 1/5
2. 2/5
3. 5/5

нуцца на экзамен. У сувязі з гэтым яны лёталі па магазінах і крамах. Ева шукала сярэбраных туфлікаў-балерынак, а Оля — кароткай спаднічкі і белай сумкі да сваіх белых чаравікаў. Усе сябры, вядома, вельмі ім зайздросцілі поспеху ў прадметным конкурсе.

Кажуць, праблемы ёсць усюды.

Мае сяброўкі не ведалі які ім зараз выбраць ліцэй і замест заахвочваць нас да саліднай навукі, яны наракалі. Чамусьці адразу падазравалі сябе ў тым, што выберуць не найлепшы, а найгоршы ліцэй.

Мы падумалі, што поспех — гэта таксама праблема, асабліва калі ён атрымаўся без поту і змагання.



## МУХА ЦІП-ТОП!

### — (29) —

**Разам з Ганкай, Соняй і Касяй мы пайшлі ў пятніцу на рок-канцэрт. Імпрэза пачыналася ў сем гадзін у адным кафэ-бары. Там мелі выступіць тры беларускія гурты.**

Мы апрануліся зусім звычайна, бо не хацелі выглядаць як прадстаўнікі нейкай субкультуры. Гэта была наша памылка. У кавярні я стала сябе адчуваць быццам нейкі „пакемон". Уся моладзь была апранутая „на чорна" і амаль усе на нагах мелі чаравікі *гляны*. Я пабачыла таксама скейтаў, якія слухаюць панк-рок. Мы занялі вольны столік. Пасля хвіліны я пабачыла, што каля нас сядзіць саліст аднаго рок-гурту і сам з сабой п'е гарэлку.

— Ён так заўсёды робіць перад выступленнем, — сказала Ганка, — толькі тады ён свабодна адчувае сябе на сцэне. Інакш ён не ўмее раскавацца!

Першыя „кавалкі" канцэрта ўсе сядзелі на месцы. Але пасля трох песень моладзь хлынула перад сцэну і стала танчыць *пога*. І мы з сяброўкамі таксама туды пабеглі. Я яшчэ ніколі не танчыла гэты танец. Спачатку я таўклася збоку, але нейкі хлапец увапхнуў мяне ў сам вір танца. Некалькі разоў нехта грукнуў у маю нагу *глянам*.

У час перапынку мы з сяброўкамі падышлі да бара. Вада, якую мы купілі, была даражэйшай за піва і яе было ў шклянцы як на лякарства. Мы ўваткнулі ў адну шклянку чатыры саломкі і адразу высушылі яе змесціва. Пасля чатырох порцый вады мы крыху пагасілі смагу і хацелі вярнуцца за свой столік, каб адсапціся. Аднак на нашым месцы спаў саліст рок-гурту, той самы, які

## МУХА ЦІП-ТОП!



раней сам піў гарэлку. А суседні столік, дзе раней сядзеў артыст, якраз занялі скейты. Сярод іх мы прыкмецілі сяброў нашага Ігара. Быў там высокі „Шчупак", Адр'ян, які апавядаў нам пра сваю субкультуру на прэм'еры фільма аб скейтах і ўнучак спадарыні Воўк. Хлопцы прыкідваліся быццам бы нас не памятаюць. Мы таксама не хацелі першымі з імі вітацца. Аднак калі ўсе мы пайшлі танчыць *пога*, скейты сталі нас таўчы локцямі і запіхваць на сярэдзіну танцпляцоўкі. І так да канца. Мы папіхаліся як нейкія таўкачы, аднак ніхто з нас не меў адвагі загаварыць.



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (30) —**

**Апошнім часам мы з Ганкай многа свабоднага часу праводзім з Матвейкам. Разам ходзім у кіно паглядзець фільм-жахалку, каб пасля пасмяяцца са штучных страхаў. Разам ходзім у піцэрыю, каб там пры піцы перакінуцца нашымі жартамі, якіх ніхто, апрача нас, не разумее.**

У суботу мы пайшлі на Адкрыты дзень у III Агульнаадукацыйны ліцэй. Мы вельмі хочам вучыцца ў гэтым ліцэі. Там многа нашых сяброў ды ў самой школе пануе прыемны клімат. Наша сяброўка Зося сказала, што хаця іх ліцэй найлепшы ў горадзе, яна вучыцца зараз менш, чым у нашай гімназіі. Пры гэтым мае яна добрыя ацэнкі.

Мы дамовіліся на 9 гадзін раніцы ля III ліцэя, але Ганка мела праблемы з даездам са сваіх Крынічак. Яна, традыцыйна, была вымушана дабірацца аўтаспынам.

У будынак школы мы ўвайшлі з малым спазненнем. У зале н-р 105, дзе ўсё адбывалася, было ўжо шмат гімназістаў з усяго горада, а нават ваяводства. Мы крыху дзіўна сябе адчувалі ў гэтай кампаніі, паколькі былі мы на год малодшыя за апошніх — у ліцэй мы пойдзем ажно праз два гады. Моладзь з ліцэя падрыхтавала нам кароткі спектакль і конкурс. Рэжысёрам быў найбольшы зубрыла ў школе Цэзар Чэх. Раней ён вучыўся ў нашай гімназіі. Спектакль увогуле не быў смешны, але ўсе прыкідваліся, што пастаноўка іх смешыць і нават смяяліся. Найсмяшней было на канец. Цэзар запрасіў да конкурсу трох добраахвотнікаў. Вядома — я, Ганка і Мат-



вейка першыя паднялі рукі і пайшлі да дошкі. Цэзар падрыхтаваў нам пытанні па сусветнай літаратуры і гісторыі мастацтва. Мы падышлі да ўсяго з пачуццём гумару, адказвалі наўдалую, асабліва Матвейка. І дзіва, гэта ён назбіраў найбольш балаў. Другое месца заняла я, трэцяе Ганка. Цэзар уручыў нам узнагароды — мыла, муку і цукар. Ён, відаць, палічыў, што яго падарунак дасціпны. Аднак мяне ён зусім не смяшыў, такі ж сувенір я атрымала ад Ганкі на „Валянцінкі”.

Пасля конкурсу мы яшчэ абышлі ўсе залы і размаўлялі з вучнямі. Зося сказала, што ў іх школе вельмі многа моладзевых субкультур і кожны тут апранаецца як хоча. Гэта вельмі нас уцешыла і яшчэ больш заахвоціла паступіць у III ліцэй.

Ёсць аднак малая праблема. Нашы ацэнкі! У гэты ліцэй прымаюць толькі выдатнікаў. Пасля, калі мы сталі лічыць свае балы, дайшлі да вываду, што астаецца адзін выхад: зубрыць, зубрыць і яшчэ раз зубрыць. Таму, калі я падумаю пра трэці клас гімназіі, у мяне пачынае кружыцца галава. Я бачу сябе як дзень і ноч сяджу за кніжкай, а класныя сябры паказваюць на мяне пальцам і клічуць „зубрылай”!



# МУХА ЦІП-ТОП!

**— (31) —**

**У апошні тыдзень красавіка я лічыла дні да пятніцы. У гэты дзень пачынаўся доўгі уік-энд. Мае сяброўкі таксама не маглі дачакацца вольных дзён. Мы дамовіліся, што будзем катацца на веласіпедах, хадзіць у парк, на пакупкі і вучыцца ездзіць на скейце.**

У першы вольны дзень мы з Касяй і Соняй паехалі да Ганкі. Вечарам мы пайшлі на рок-канцэрт. Калі мы вярнуліся да нашай сяброўкі, яе бацькі ўжо спалі. Нам было вельмі цяжка паводзіць сябе належным чынам, значыць, быць ціха, паколькі вельмі хацелася пасмяяцца. Тым больш, што ў мяне і ў дзяўчат неўтаймаванае пачуццё гумару — мы можам смяяцца з усяго, нават калі няма з чаго.

Нягледзячы на позні час нашага вяртання да Ганкі, мы пайшлі спаць толькі ў пяць гадзін раніцы.

У наступныя дні было вельмі брыдкае надвор'е. Я паехала да бабулі ў вёску.

Дзяўчаты таксама паехалі да сваякоў, тым больш, што ў нашым горадзе нічога цікавага не дзеялася. Першыя выхадныя дні цягнуліся як бразільскія тэлесерыялы.

У сераду, разам са мной, у Беласток вярнулася вясна. Я адразу дамовілася з дзяўчатамі паездзіць на ровары. У час веласіпеднай экскурсіі па горадзе мы сустрэлі многа знаёмых: нашу выхавацельку Аўрэлію з мужам і сябру Ігара, які сёння памяняў скейт на ровар. Мы дамовіліся на суботу. Наш сябра меў навучыць нас ездзіць на скейце. Папраўдзе я не магла дачакацца гэтага дня і таму, каб прыспешыць час, мы з мамай пай-



шлі на вялікія пакупкі: я купіла спаднічку „міні” і туфлікі „балерынкі”, кашульку ў гарошкі, якая цяпер вельмі модная. Мой бацька традыцыйна панаракаў. Ён дакараў мяне за тое, што я растраціла ўсе грошы, якія дала мне бабуля. Аднак прызнаўся, што рэчы, якія мы купілі — прыгожыя.

Кася і Соня не хацелі вучыцца ездзіць на скейце, таму ў суботу на сустрэчу з Ігарам я пайшла з Ганкай. Апрача нашага сябры, ля тэатра, дзе звычайна сустракаюцца ўсе скейты горада, былі таксама хлопцы, якіх мы сустрэлі тыдзень раней на беларускім рок-канцэрце. Гэта былі „Шчупак”, Адр’ян і ўнучак спадарыні Воўк.

— Я, здаецца, ведаю тваіх сяброўак, — сказаў Адр’ян. — Ці яны не былі на прэзентацыі нашага фільма?

— Былі-былі, — адказаў Ігар. — Я нават вас з імі пазнаёміў. Але я памятаю іх яшчэ з нейкага рок-канцэрта.

Якраз тады, калі мы танчылі *пога* з яго сябрамі, Ігар астаўся дома. І цяпер ён не ведаў што сказаць:

— Тады пазнаёмцеся яшчэ раз, — прапанаваў ён.

Мы яшчэ раз пазнаёміліся. Цікава на як доўга? Але самае важнае тое, што ў гэты дзень мы пачалі ездзіць на скейце. Хлопцы ахвотна сталі нашымі інструктарамі. „Шчупак” вучыў Ганку, мяне — Адр’ян. Першы ўрок быў проста камічны. Ужо ў час першай спробы мы грымнуліся шмат разоў аб голы бетон, пабілі локці і калені, набылі многа сінякоў. Аднак ніхто са скейтаў не звяртаў увагі на такую дробязь. Раны і кроў — для іх частка гульні.

Мы зразумелі, што гэты спорт не надта цікавы для дзяўчат, але першы ўрок трэба было дацягнуць да канца.

## — (32) —

**Вы ўжо ведаеце, што вучням нашай гімназіі нельга хадзіць на перапынках у краму. У сувязі з гэтай забаронай многа асоб спазняецца на ўрокі. Мы чакаем канца перапынка, а пасля, калі няма ўжо дзяжурных у дзвярах, крадком пранікаем у краму спадара Антося.**

У апошні аўторак такая прыгода здарылася мне, Ганцы, Соні і Касі. Мы былі галодныя як ваўкі і ведалі што мусім нешта з'есці.

— Але мы спознімся на ўрок фізікі — сказала я.

— Нічога, — махнула рукой Ганка, — а што, памерці нам ад голаду?!

Калі мы ўбеглі ў клас, спадар Янка Віснеўскі правяраў прысутнасць.

— Дзе вы былі? — спытаў нас.

— Ы-ы-ы-ы, — мы не ведалі што сказаць і ў канцы Соня зманіла: — Мы былі ў нашай выхавацелькі!

— Сядайце за свае парты, — загадаў Віснеўскі.

Мы з Ганкай пайшлі сесці на сваю парту, але месца было занятае. Сядзеў там малады мужчына з доўгімі валасамі, павязанымі ў хвосцік, з вусамі і рыжай бародкай. Мы дадумаліся, што гэта студэнт-практыкант. Мы з Ганкай селі перад студэнтам і пачалі есці булкі, паколькі мы былі вельмі галодныя.

— Смачна есці! — перабіў нам практыкант. Ён усміхнуўся і нешта запісаў у сваім дзённіку.

— Дзякуй-дзякуй! — адказалі мы. Аднак

## МУХА ЦІП-ТОП!



нам было сорамна і мы схавалі ежу.

— Ён выглядае як рускі мафіозі, — прашаптаў Ігар, які сядзеў перад намі. І дадаў: — Ганка, намалюй яго!

Маёй сябоўцы два разы не трэба было паўтараць. Яна хуценька схапіла аловак і намалявала студэнта, у канцы майго сшытка па фізіцы. Калі рысунак быў гатовы, Ігар прыдумаў герою імя — „Саша". Чамусьці гэтае імя яму асацыявалася з рускай мафіяй!

У гэты час Віснеўскі спрачаўся з Соняй наконт нейкай задачы. Калі настаўнік пабачыў, што мы паміраем ад смеху, наблізіўся ў наш канец:

— Пакажы, калі ласка, свой сшытак! — загадаў мне настаўнік. Я не ведала што рабіць і ад гэтага ўсяго аддала сшытак. Віснеўскі спачатку таксама стаў смяяцца. І хто ведае як пакаціліся б справы, каб не наша выхавацелька. Так, у клас увайшла Аўрэлія. Мы з дзяўчатамі напалохаліся, бо за момант нас мелі злавіць на мане.

— Паглядзі, якія прыгожыя рысункі Муха Барбара мае ў сваім сшытку, — сказаў з нотай іроніі настаўнік фізікі.

— Сапраўды прыгожыя, — выхавацелька шчыра захапілася пабачаным і дадала: — Гэты чалавек мне некага напамінае.

Мы пачырванелі. Мабыць нашы настаўнікі падумалі, што мы закаханыя ў студэнта. І то з першага погляду.

Але ёсць і адзін станоўчы бок Ганчынага мастацтва. Віснеўскі забыўся спытаць Аўрэлію ці сапраўды з-за яе мы спазніліся на ягоны ўрок.

Скажу яшчэ...

Я і мае сяброўкі не можам дачакацца наступнага ўрока фізікі. Урок будзе весці „Саша"!

## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (33) —**

**Апошнім часам я і мае сяброўкі культурна праводзім пятніцы. Ходзім на канцэрты, знаёмімся з цікавымі людзьмі. Сказаць па шчырасці — я цэлы тыдзень чакаю гэтага дня.**

У чацвер вечарам пазваніла мне Соня і сказала, што ў наш горад прыязджае славуты журналіст і комік у адной асобе. Я адразу рашыла: нам мусова там быць. Я пазваніла Ганцы, Касі і Матвейку. Мае сябры таксама не маглі дачакацца сустрэчы.

— Я вазьму з сабой фотаапарат, — сказаў Матвейка, — можа ўдасца зрабіць хоць адзін здымак з Шыманам Гаеўскім. Пасля мы паставім гэты здымак на сайт: fotka.pl…

Мне спадабалася ідэя Матвейкі. Мала хто ведаў пра сустрэчу з комікам і мы мелі нагоду бліснуць перад сябрамі, бо гэтая асоба вельмі папулярная ў нашым класе.

У пятніцу, пасля ўрокаў, мы адразу пабеглі ў кніжны магазін, дзе меў выступіць наш кумір. Хаця наша пяцёрка была напаўгадзіны раней, мы апынуліся на канцы доўгай чаргі. Шыман спазніўся яшчэ на гадзіну. Вядома, такой зорцы не выпадае з'явіцца пунктуальна. Аднак найбольш здзіўляла нас тое, што Гаеўскі гаварыў з кожным як з сябрам. Ідучы на сустрэчу, мы думалі, што Гаеўскі, як большасць вялікіх зорак, стане перад публікай, скажа, што „нас кахае" або што мы ёсць „супер", а пасля без аглядкі з'едзе ў Варшаву.

Мы падышлі да століка.

— Вы хіба з адной школы? — спытаў нас Гаеўскі.


ШЫМОН
ГАЕЎСКІ

— Так, — адказалі мы хорам, — і з аднаго мы класа.

— А чаму вы не прыйшлі са сваёй дырэкцыяй? — спытаў госць.

— Спадарыня Кіра Воўк надта сур'ёзная асоба, — адказалі мы, — яна мабыць не любіць тваёй перадачы.

— Магчыма, — заявіў комік.

— А мо ты, Шыман, ведаеш спадарыню Воўк? — спытаў адразу Матвейка. — Спадарыня Воўк адыходзіць ужо на пенсію.

— Шкада, — уздыхнуў комік.

Сярод публікі запанавала клапатлівае маўчанне. Ніхто не ведаў чаму першы шаўмен ў краіне раптам страціў пачуццё гумару. Мы таксама не ведалі што сказаць. Мы папрасілі Шымана яшчэ паставіць аўтографы і зрабілі супольны здымак.

— Кіра Воўк была маёй выхавацелькай! — сказаў нам у сакрэце Шыман Гаеўскі.



## МУХА ЦІП-ТОП!

**— (34) —**

**Даўно ўжо я нідзе не выходзіла са сваёй мамай. Памятаю, раней мы разам хадзілі ў кіно, тэатр, на выстаўкі. Цяпер увесь вольны час я праводжу з сябрамі. У мінулую суботу мама падмовіла мяне схадзіць на „ноч у музеі”.**

Я была захоплена гэтай прапановай, таму што мела нагоду пабачыць выстаўку Фёдара Карасевіча, пра якую гаварылі ў горадзе. „Ноч у музеі” — гэта ноч, калі адкрытыя ўсе музеі і іх можна аглядаць бясплатна. Паколькі гэтая акцыя вельмі папулярная ў Еўропе, наш Беласток таксама не хацеў быць горшым. Калі познім вечарам мы выйшлі на вуліцу, тут, быццам у самы будзённы дзень, перамяшчалася мора народу.

— Ці ўсе гэтыя людзі спяшаюцца ў музей? — спытала напалоханым голасам мама.

Мы сустрэлі настаўніка рэлігіі Нягарчука з жонкай, спадара Тоська — уласніка крамы „У Антося”, практыканта „Сашу”, скейтаў...

— Няўжо і яны ў галерэю? — з недаверам паўтарала мама.

Спачатку я думала, што ўсю ноч будзем хадзіць па музеях і галерэях. Аднак мой план не спрацаваў. Каб абысці ўсе музеі ў нашым горадзе, мы патрабавалі толькі дзве-тры гадзіны. Каля Музея вайны была такая чарга, што мы адразу абмінулі яго шырокім кругам. Мы пераціснуліся праз натоўп *дрэсаў* з сабакамі і адразу пайшлі ў галерэю „Шпак”. На месцы я пабачыла Ганку з яе мамай.

— Я бачыла тут свайго настаўніка мастацтва, — сказала мая сяброўка. — Ён зага-



даў, каб я дакладна аглянула выстаўку Карасевіча. На ўроках будзем гаварыць і маляваць у яго стылі.

— Як файна! Тады, пайшлі ўсярэдзіну, — сказала я.

Нягледзячы на сантыментальны маршрут з мамай, я дзіка ўцешылася, калі нечакана сустрэла Ганку. У пэўным узросце цяжка мець такія ж погляды як бацькі. Штосьці заўсёды перашкаджае — інакш глядзім на кожную справу, хоць бы на мастацтва.

І зараз таксама...

Мы з Ганкай захапляліся выстаўкай Карасевіча. Мы былі ашаломленыя ад яе, асабліва лабірынтам, які прыдумаў мастак. Гэта быў квадрат у жоўта-чырвона-блакітныя палоскі, велічынёй не большы ад маёй прыбіральні. Аднак, дзякуючы люстрам, ён здаваўся доўгім і пакручастым, як лабірынт. Мы, вядома, зрабілі сабе тут шмат здымкаў, каб пасля памясціць іх на сайце: fotka.pl.

У галерэі яшчэ прэзентаваліся запісаныя на відзіку мастацкія перформенсы з цэнтральнай Азіі. Мяне і Ганку яны не прывабілі, але мая мама як прыкаваная сядзела ля экрана:

— Вы замала інтэлігентныя, каб іх зразумець, — з відавочнай нотай іроніі пракаментавала яна нашу абыякавасць да фільмаў.

— Ну, зразумела, — адказалі мы і пабеглі на двор. Пасля нейкага часу на пляцы перад галерэяй выступіў гурт „Пластэлін”. У час канцэрта перад сцэнай танчыла дзіўная моладзь. Усе ў стылі хіпі. Яны прадстаўлялі эфектоўны танец з агнём.

— Ці ты бачыш тое, што я бачу? — спытала мяне дрыжачым голасам Ганка.

— Я бачу... што ты таксама бачыш, — адказала я.

Спачатку мы сталі разглядацца, ці сярод публікі няма сяброў з класа. Сярод танцораў-хіпі была... мая мама. Яна мела распушчаныя валасы, а на сабе — доўгую чырвоную спадніцу, з-пад якой выставалі голыя ступні.

Дадам толькі, што мая мама вельмі папулярная ў маім класе, асабліва сярод хлопцаў, якія клічуць яе *старая хіпіска*!



## — (35) —

**Апошнім часам Ігар меў дрэнны настрой. А ўсё з-за сяброў: Шчупака, Адр'яна і ўнука спадарыні Воўк. Хлопцы паехалі ў Гданьск на міжнародныя спаборніцтвы па скейце.**

Ігар не мог паехаць разам, ён паламаў два пальцы правай нагі. Лекар забараніў яму нават дакранацца да скейта. Хлапец з неахвотай хадзіў у школу, дзе многія яму зайздросцілі поспехаў у яздзе на скейце, а найбольш поспеху сярод дзяўчат.

У панядзелак Паўл, Сяргей і Міколка распусцілі плётку, што я або Ганка — дзяўчына Ігара! Нас знервавалі гэтыя словы, ні адна з нас не думала пра такое. Мы проста вельмі добрыя сябры. Не разумею, чаму ў нашай гімназіі нельга звычайна сябраваць з хлопцам?!

Плётка прыдуманая Паўлам разышлася не адно сярод вучняў, яна дайшла і ў настаўніцкі пакой. Калі я ішла калідорам з абеду, спадар Янка Віснеўскі падышоў да мяне і спытаў:

— Чаму твой хлопец не прыйшоў сёння на мой урок?

Я пачырванела як бурак і не ведала што сказаць.

Аднак найгоршыя былі хлопцы з нашага класа. Яны ўвесь час дапікалі мне і Ганцы:

— Твой Ігар слухае безнадзейную музыку, — сказаў Паўл. — Што гэта за музыка *панк?* Яе слухаюць ідыёты. Нармальны хлопец у нашым узросце павінен слухаць толькі і выключна *метал!*

Ігар, вядома, пра ўсё даведаўся. Ён знер-

# МУХА ЦІП-ТОП!



ваваўся так, што аж выклікаў Паўла на дуэль.

Пасля матэматыкі на калідоры сабралася палова нашай гімназіі. Усе хацелі паглядзець на „рыцараў", якія мелі пабіцца за Муху або Ганку.

Спачатку бойка была выроўнай, але Ігар не дараваў. Ён быў настолькі знерваваны і злосны, што ў канцы адолеў Паўла. Проста — разлажыў яго на лапаткі. Цікавая вайна — фан лагоднай музыкі *панк* перамог паклонніка агрэсіўнага *металу!*

Але тут не было смешна. Хлопцы пабіліся да крыві, наступны крок Паўл правёў у лекарскім кабінеце. Добра, што дырэкцыя не пазваніла бацькам або на паліцыю.

На дуэль між *панкам* і *металам* глядзела палова гімназістаў. І цяпер, калі я іду па калідоры, чую злосныя зачэпкі і каментарыі:

— Каго выбярэш, Муха? Ігара ці Паўла?

Я маўчу.

Справа ў тым, што я слухаю рок-музыку ў класічным варыянце.



## — (36) —

**Вы пэўна ўжо забыліся пра класнага жуліка Міколку. Я пра яго даўно не пісала, бо ён, дзякуючы сваёй дзяўчыне, стаў ідэалам. Усе настаўнікі былі захоплены гэтай метамарфозай, але мы, вучні — не!**

Кожны мой аднакласнік жадаў, каб ён расстаўся з дачкой настаяцеля і зноў стаў Міколкам, як раней.

Учора мы з Ганкай і Касяй пайшлі ў царкву на абедню. Нас вельмі здзівіла, што сярод прыслужнікаў не было нашага сябры. Мо ён пасварыўся з Марысяй?

— А можа яны рассталіся, — падумала ўголас Кася.

— Не думаю, — адазвалася Ганка, — я ўпэўненая, што ён быў у царкве на ютранні.

Ганка аднак памылялася. Мы пасля даведаліся ад Ігара, што Міколка ўсю нядзелю ездзіў з ім на скейце.

— Супер! — выгукнулі мы ў адзін голас. — Міколка зноў будзе Міколкам! Супер! Супер! Супер!

У панядзелак хлапец зусім інакш апрануўся, ён не быў як апошнім часам у белай кашулі і камізэльцы, а толькі ў блузе з капюшонам.

— Міколка мае новую дзяўчыну, — сказаў нам на перапынку Ігар, — і вяртаецца да сваіх прывычак. Учора вечарам ён пабіўся з *дрэсамі* і *скінхедамі*...

— Але ж раней ён сам быў *дрэсам*, — здзівілася я, — няўжо ён памяняў субкультуру.

— Ну так! — усміхнуўся Ігар. — Яго новая дзяўчына ёсць *эмо*. Ды і ён мусіць цяпер быць такім як яна.



— Мусіць? — спыталі мы хорам... Бо адказ Ігара нас захапіў.

— Ну так!

— І цяпер ён ездзіць з табой на скейце? — спытала Ганка.

— Стараецца.

— *Востра!*

— Хоць лепш калі Міколка будзе *эмо*, — сказала Кася, — бо як выдатнік ён быў нецікавы.

— А чаму ён расстаўся з Марысяй? — пацікавіліся мы.

— Гэта яна яго кінула.

— Бедны Міколка, — сказала я, хоць папраўдзе я не спачувала яму.

Мы пайшлі на ўрок інфарматыкі. Настаўнік на момант пакінуў нас саміх у зале і не выключыў свайго камп'ютэра. Большасці вучням нашага класа пагражае тройка па гэтым прадмеце, таму Міколка дарваўся да камп'ютэра настаўніка, каб памяняць нашы ацэнкі на лепшыя.

— Хутчэй, хутчэй! — паганяў яго Паўл. У яго былі самыя дрэнныя ацэнкі па інфарматыцы. І цяпер ён лічыў, што наш жулік яго выратуе. Аднак Міколка не паспеў.

— А што ты, Коля, тут робіш? — здзівіўся настаўнік, які нечакана вярнуўся ў клас.

— Я таго... — запыкаўся новаспечаны скейт, — я правяраю апошнюю тэму.

— Добра, — з насмешкай сказаў інфарматык, — тады раскажы, што было на апошнім уроку.

Міколка, як вядома, усю нядзелю правёў на скейце і не быў падрыхтаваны. Ён з ходу атрымаў адзінку. Першую ад двух месяцаў!

**У апошні тыдзень навучальнага года ў нашай гімназіі адбыўся форум класаў. Большасць вучняў не хацела ўжо нічога рыхтаваць пад гэтую імпрэзу, аднак я і мае сябры вырашылі прыдумаць нешта „супер" і заваяваць галоўную ўзнагароду.**

Наша выхавацелька не падтрымала нас, яна нават не прыйшла на форум класаў. Таму ў апошні панядзелак, 18 чэрвеня, мы выйшлі на сярэдзіну гімнастычнай залы з аўтарскім спектаклем „Следства ў справе смерці Мэрлін Манро". Нашай пастаноўкі не бачыла ні адна дарослая асоба. Не мушу вам хіба пісаць, што наш клас быў вельмі ўпэўнены ў сваім акцёрстве ды ніхто не хваляваўся перад выхадам на сцэну. Мы падрыхтаваліся, так сказаць, на хаду. У пятніцу Ганка раздала ўсім сцэнарый, раздзяліла ролі, дадаткова мы прыдумалі два танцы, а ў суботу мы сустрэліся, каб навучыцца песень. У нядзелю было такое цудоўнае надвор'е, што ў панядзелак — у дзень выступлення, ніхто не ўмеў прачытаць з памяці сваёй ролі. Я, Ганка і Соня ігралі дэтэктываў, таму схавалі свой тэкст у сшыткі, якія ляжалі на нашым стале. Кася, якая выконвала ролю галоўнай гераіні Мэрлін Манро, вывучыла тэкст на гадзіну да выступлення. Матвейка, наш вялікі абібока, нават не пакарыстаўся прыкладам Касі і сваю ролю напісаў сабе на руцэ.

— Як гэта будзе выглядаць, калі будзеш чытаць з рукі? — усхвалявалася Ганка.

— Ну, але я іграю „псіха" і гледачы падумаюць, што гэта так трэба! — бараніўся хлапец.

Іншыя асобы, напрыклад, Ігар, які іграў нарачонага Мэрлін, ці Ксэня, якая была яе

# МУХА ЦІП-ТОП!



саперніцай, мелі вельмі кароткія ролі і ўвогуле нічым не пераймаліся.

Перад намі выступілі ўсе першыя класы. Паводле мяне гэта былі не надта цікавыя выступленні, з дзеравяным акцёрствам і банальным рэпертуарам. Настаўнікам вельмі спадабаўся спектакль I „а" класа, у якім расхвальваліся настаўнікі нашай гімназіі. Вучням гэтая пастаноўка зусім не падышла да густу, наадварот, нас хвалявала падхалімства і не-праўдзівасць тэкстаў. Акцёры з I „а" ігралі як спартмены, якіх прымусілі заняцца тэатрам.

Мы выступілі ў канцы прэзентацый, таму што ні адзін з другіх ці трэціх класаў не прыйшлі на форум. У зале было ўжо мала гімназістаў — большасць публікі проста даканалі ранейшыя выступоўцы. Нам вельмі дрэннаігралася пры малой публіцы, хаця ў нас быў жывы і інтэлігентны сцэнарый, песні і танцы. Наша драма кранала праблему мастацтва і цаны, якую трэба заплаціць за сапраўднае акцёрства!

Паводле рашэння журы мы занялі перадапошняе месца. Праўда, ужо на пачатку, калі мы пабачылі хто з'яўляецца сябрам журы (Нягарчук, Ляскоўскі, Воўк), у нас з'явіліся чорныя прадчуванні.

Як вы пэўна дадумаліся, пераможцамі сталі акцёры з I „а" класа. Спачатку нам стала вельмі сумна, што ў нашай школе ўзнагароджваюць падхалімаў. Але калі мы даведаліся, што галоўная ўзнагарода — гэта пірог, які спякла спадарыня Воўк, мы не мелі ўжо так дрэнных настрояў. Лаўрэаты першага месца таксама не выглядалі на шчаслівых, калі атрымлівалі ўзнагароду.

— Гаеўскі таксама быў недаацэненым акцёрам у нашай школе, — кінуў весела Матвейка.

## — (38) —

**Было ўжо 22 чэрвеня, а я ўвогуле не адчувала, што сёння канчаецца навучальны год. Скажу праўду, я не хацела гэтага. Нядаўна ў маёй школе разышлася вестка, што быццам бы спадарыня Воўк пасля канікулаў адыходзіць на пенсію.**

Я не ўяўляю нашай гімназіі без гэтай жанчыны. Праўда, яна была вельмі суровай дырэктаркай. Аднак вучні ўспрымалі яе з пачуццём гумару і часта жартавалі.

— А як на месца спадарыні Воўк прыйдзе яшчэ больш суровая асоба? — кінуў Паўл.

— Будзе *змула*, — сказала я. — Шкада, што спадарыня Воўк не астанецца яшчэ на адзін год, тады мы б спакойна закончылі трэці клас.

— Яна працуе ў гэтай школе ўжо 40 гадоў! — абурыўся Сяргей, — дазвольма ёй адпачыць ад нас.

— А ці вядома ўжо хто ў наступным годзе заступіць спадарыню Воўк? — спытала Ганка.

— Я чула, што ў конкурсе прымаў удзел нейкі настаўнік рэлігіі, — сказала Ксеня.

— Няўжо *Нягара*?! — падумалі ў голас усе вучні.

— Пакуль нічога невядома, — сказала Соня. — Можа гэта *Нягара*, а можа хто іншы...

Гэтая гутарка вялася ў час, калі мы ў сваёй зале чакалі выхавацельку, якая мела раздаць пасведчанні. Аўрэлія, як заўсёды, спазнілася 15 хвілін. Яна ўручыла нам пасведчанні, прытым не шкадавала крытычных заўваг. Сапраўды, не было чым цешыцца. На 25 асоб у класе толькі дзве атрымалі пасведчанні з бел-чырвонай палоскай. Гэта былі нашы выдатніцы — Марта і Ксеня. Каб атрымаць та-



кое пасведчанне, трэба мець сярэднюю 4,75 бала, а мы з Ганкай мелі па 4,72. Падобная сітуацыя была ў Міколкі, якому не хапіла толькі адной пяцёркі.

— Усё з-за дурной адзінкі па інфарматыцы! — крычаў хлапец. — Каб я не атрымаў гэтай адзінкі на апошнім уроку, усё было б інакш.

— Не перажывай, Міколка, — сказала я, — у мяне таксама ўсё сапсавала інфарматыка.

— Мусім папправіць сабе настрой, — сказаў хлапец, — можа сарганізуем сёння развітальнае вогнішча?

— Так! Так! Так! — усе вучні нашага класа загарэліся да гэтай прапановы.

— Толькі дзе і калі?

— Прыязджайце да мяне, — першы з прапановай выйшаў Матвейка, — пачатак у 17 гадзін.

Матвейка жыве на перыферыі горада, у квартале, які мы празываем *фабрыкай сцен* (чытайце: Засценкі).

У 17 гадзін вучні ўжо III „ф" класа былі ў Матвейкі на панадворку. Мы ўключылі песні, з якіх у гэтым годзе мелі найбольш смеху ды сталі ўспамінаць найлепшыя падзеі года. Аднак наша радасць не трывала доўга. Да нас завітаў сусед Матвейкі. Ён увайшоў за браму і з ходу пачаставаў нас аплявухай:

— Пайшлі прэч! Я, як дырэктар школы, не жадаю вашай кацячай музыкі ля свайго акна.

На момант мы замерлі. Перад намі стаяў спадар Нягарчук, наш настаўнік рэлігіі і новы дырэктар школы.

— Ну і гардкор! — пракаментаваў Міколка.

Я вам дам гардкор! — крыкнуў Нягара.

Мы напалохаліся, — аднак сваёй музыкі не выключылі.

## Гардкор-2007
## або Муха ціп-топ на канікулах

**— (1) —**

**У пачатку ліпеня ў Гімназіі н-р 27 адбылася першая педагагічная рада, якую склікаў новы дырэктар. На гэтай сустрэчы працаўнікі школы мелі вырашыць складанае пытанне: каторыя чатыры жулікі з нашай школы паедуць на экстрымны лагер „Гардкор-2007”.**

— Мне здаецца, што ў нашай школе няма такіх дрэнных вучняў, каб выпраўляць іх у гэтае страшнае месца, — сказала настаўніца біялогіі Аўрэлія.

— Ёсць! — ажывіўся інфарматык. — Я думаю, што Міколка з III „ф” можа ўжо збіраць манаткі і шыбаваць на гэтую імпрэзу. Ха-ха!

— Кінь ты! — абурылася Аўрэлія. — Гэты хлапец вельмі памяняўся ў апошні час. Гэта ўжо не той самы Міколка. Ён не толькі пачаў хадзіць у школу і добра вучыцца. Ён нават ужо не б’ецца з хлопцамі.

— Бачу, што маем праблему, — сказаў настаўнік фізікі Віснеўскі. — Калі не пашлем на летнік ні адной асобы, змарнуюцца нашы грошы.

— Не! Так не будзе! — запратэставаў Нягарчук. — Я маю чатыры адборныя кандыдаткі...

— Якія кандыдаткі? — жахнуліся настаўнікі. — Хто гэта такі?

— Вучаніцы III „ф” класа, — аб’явіў з яхіднай усмешкай Нягарчук. — Гэта Бася Муха, Кацярына Міцкевіч, Ганна Генюш і Сафія Квяткоўская...

# МУХА ЦІП-ТОП!



Пасля слоў дырэктара настаўнікам проста адняло мову. Усе былі ў шоку. Першая адазвалася Аўрэлія:

— Яны ж зусім нядрэнныя дзяўчаткі...

— Вы не можаце супраціўляцца маёй волі! — узлаваўся Нягарчук.

— Гэтыя вучаніцы маюць нядрэнныя ацэнкі і паводзяць сябе належным чынам, — заступіўся яшчэ Віснеўскі. — Праўда, яны шалёныя, але гэта зусім нармалёва ў іх узросце.

— Так! Так! — выгукнулі ў адзін голас настаўнікі.

— Я бачу, што вы, Віснеўскі, хочаце страціць працу! — шыкнуў дырэктар.

— Не! — фізік найперш пабялеў, пасля пачырванеў, зноў збялеў...

— Дык сціхніце! — суровым тонам загадаў Нягарчук. — Я хачу вам сказаць яшчэ адну справу.

Настаўнікі напалохаліся. Яны добра ведалі, што новы дырэктар — чалавек непрадбачлівы.

— Адзін з вас мусіць паехаць на гэты „Гардкор-2007".

— Чаму ? — усе настаўнікі былі ашарашаны апошняй весткай.

— Таму, што з нашай школы павінен быць адзін настаўнік, — сказаў Нягарчук.

— Ці гэта абавязкова? — спалоханым голасам спытала Аўрэлія.

— Так! — заявіў дырэктар. — Я прапаную, каб мы паслалі туды нейкага мужчыну.

— Ці гэта *фэр?* — абурыўся Віснеўскі. — Чаму якраз мужчыну? У нас дэмакратыя. У нас таксама канікулы.

— Сядзі ціха, Віснеўскі! — грымнуў Нягарчук. — Я нават не падумаў пра цябе. Ты не перажыў бы там аднаго дня.

Настаўнік фізікі з пакрыўджанай мінай падняўся з-за стала і выйшаў з настаўніц-

кага пакоя.

— Ха - ха - ха! — зарагатаў Нягарчук. — Бачыце які ў мяне востры язык?!

— Бачым! — згодна адказалі настаўнікі.

У гэтым часе Нягарчук падышоў да настаўніка фізкультуры Геніка Ляскоўскага, які як мышка прыхаваўся ў кутку.

— Ты паедзеш! Думаю, што ты найлепш справішся з задачай.

— Добра! — перапалоханым тонам адказаў мужчына. — У мяне толькі адно пытанне. А ці будзе там камп'ютэр з доступам да Інтэрнэту? Я не вытрымаю больш чым гадзіны без аднаго сайта.

— Думаю, што будзе, — усміхнуўся дырэктар. — Я маю табе суперпрапанову. Ты, Генік, пастарайся, каб нашы дзяўчаты там не ляжалі як снапы. Карацей, ты зрабі ім такі *гардкор,* каб яны плакалі і шкадавалі, што жывуць. Ідзе пра тое, каб яны самі выпісаліся з нашай школы! Хто ведае, можа зраблю цябе сваім намеснікам?! Ну як, згодны?

— Згодны! — адказаў на „зважай" Ляскоўскі і пабег у хату збіраць манаткі.

(**працяг „Мухі ціп-топ на канікулах або Гардкор-2007" шукайце на старонках „Нівы", пачатак у 28 н-ры за 2007 год**)